Голас Радзімы

ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА ДЛЯ СУАЙЧЫННІКАЎ ЗА МЕЖАМІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

№ 2 (2352) 13 студзеня 1994 г. Выдаецца з 1955 г.

Цана 30 рублёў.

ДЫЯЛОГІ З ЛІДЭРАМІ ПАРТЫЙ

І ЎСЁ Ж САЦЫЯЛІЗМ. АЛЕ ЯКІ?..

Нават не хочацца згадваць, што некалі быў час аднапартыйнай веры. Менавіта -- веры, бо мыслення не патрабавалася і не было. Калі ўедлівыя заходнія журналісты даймалі нашых артадоксаў "правакацыйным" пытаннем: "Чаму ўсё ж у СССР толькі адна партыя!" -- адказвалі: "Таму што КПСС выказвае інтарэсы ўсяго народа. Таму што нашаму працоўнаму народу непатрэбны ніякія іншыя партыі".

Сёння ніхто так не скажа, нават камуністы, калі ў іх ёсць штосьці ў галаве. Бо людзі думаюць, выбіраюць, а потым ужо вераць той партыі, якую выбралі. Шматпартыйная стракатасць беларускага палітычнага жыцця можа засведчыць, што як бы мы ні празывалі нашу дэмакратыю, а яна ўсё ж ёсць. Розныя партыі, розныя праграмы і лозунгі, розныя шляхі і мэты -- усё гэта мы маем. Нашым чытачам, асабліва тым, хто здалёк углядаецца ў палітычны далягляд Бацькаўшчыны, натуральна, цікава будзе даведацца пра кожную з партый, што з'явіліся ў Беларусі і сваёй дзейнасцю ўплываюць у большай ці меншай ступені на наша грамадства. Рэдакцыя "Голасу Радзімы" абяцае на працягу 1994 года ў "Дыялогах" даць слова лідэрам усіх партый. Так што сачыце за нашай рубрыкай.

А сёння -- гутарка са Старшынёй Цэнтральнай Рады Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады Алегам ТРУСАВЫМ.

-- Спадар Трусаў, як вы ставіцеся да сацыялізму? І як чалавек з пэўнымі перакананнямі, і як лідэр партыі сацыял-дэмакратаў?

-- Сам па сабе тэрмін "сацыялізм" я разумею вельмі шырока, бо ён мае многа самых розных вызначэнняў. Калі разглядаць сацыялізм як фармацыю, як нейкі лад жыцця, то ў цэлым я да гэтага адношуся станоўча. Як, зрэшты, і да капіталізму. Абодва гэтыя тэрміны чыста філасофскія, чыста тэарэтычныя і не маюць за сабой нічога ні кепскага, ні добрага. Гэта проста вызначэнне пэўнай сістэмы адносін у грамадстве, пэўнага ладу жыцця.

Нашы калегі, еўрапейскія сацыял-дэмакраты, прайшлі шлях ад сацыялізму XIX стагоддзя да сацыялізму канца XX стагоддзя і паказалі, што такая мадэль мае права на існаванне, нягледзячы на ўсе заганы і пэўныя недахопы. Яскравы прыклад -- шведская мадэль сацыялізму.

Такое ж права на існаванне мае і капіталізм, які прайшоў доўгую эвалюцыю і паміраць не збіраецца. Зараз на Захадзе ідзе канкурэнцыя менавіта паміж сацыялізмам і капіталізмам. Гэтыя два лады жыцця ўступаюць у зусім новую фазу развіцця. Сацыялізм -- у эканоміку салідарнага сацыяльнага грамадства, дзе ёсць пэўныя абмежаванні прыватнай уласнасці на карысць абяздоленых людзей. І ліберальная эканоміка -- гэта развіццё таго ж класічнага капіталізму, але там такіх абмежаванняў няма.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ДА ПАРТРЭТА Уладзіміра КАРАТКЕВІЧА

ПОЗНІ ЗВАНОК

У даўніх Караліўчавічах, у Доме творчасці пісьменнікаў, памятаю, аднойчы пасля адпаведнай нагоды заснуў у позе нявіннага дзіцяці ў ніжнім холе ў крэсле -- малады яшчэ тады -- Валодзя Караткевіч. Памятаю, як тады ж, таксама яшчэ па-маладому ўзбягаючы на другі паверх, як быццам няўзнак, зусім бяскрыўдна, з аднаму яму прысутным гумарам, кіўнуў на "заснуўшага Вакха" Янка Брыль:

-- Караткевіч як Вальтэр у крэсле!

З якой маляўнічай мазаікі, які партрэт атрымаўся б, каб знайшоўся майстар-мастак стварыць яго...

Партрэт Уладзіміра Караткевіча.

* * *

...Позні вячэрні званок той -- дзіўна, але мне гэтак і сёння здаецца -- прызначаўся, відаць, некаму іншаму... Вельмі блізкаму, патрэбнаму, хто мог чакаць яго, хто мог на яго спадзявацца, нарэшце, меў сяброўскае права пачуць гэты званок. Але ён у той слотны, безнадзейна панылы вечар працяў цішыню адзіноты менавіта маіх сцен.

-- Алена Сымонаўна. Гэта Караткевіч.

(Ён зваў мяне так: Сымонаўна).

Гэта было не надта подаўгу пасля таго ўжо, калі ён пахаваў Валянціну Браніславаўну. Калі застаўся ў сваіх сценах адзін. Калі ў такія панылыя безнадзейныя вечары...

-- Даруйце мне, што я гэтак позна... Што, напэўна, патурбаваў... Можа, нават пабудзіў. Але -- прашу -- зразумейце мяне: такі настрой і ўсё такое навокал, што хочацца выць. Даруйце мне!



Што было даравацъ? Як быццам самой мне было незразумелае, невядомае гэта самае "хочацца выць"...

Нешта ж я гаварыла яму. Нейкія ж словы здольная была вымавіць, хоць, напэўна, яны былі мо і не зусім тыя, якія былі патрэбныя яму, чалавеку са скразной ранай у сэрцы.

...Памятаю, як тады расказвала яму пра сваю, гэтаксама па тэлефоне, гутарку з Валянцінай Браніславаўнай, калі яна, вярнуўшы яго з таго свету ў Сімферопалі, на некалькі дзён па тэрміновай справе вярталася ў Мінск. Якой шчаслівай адчувалася яна, калі расказвала, як была ў той занядбанай паўднёвай бальніцы -- у палаце на пяцёх -- "гэтак, як і Валодзя", прыкутых да ложкаў мужчын, была ім і за няньку, і за сястру, і за маці. Як карміла і паіла іх з лыжкі, як хадзіла за імі...

-- Гаварыце, гаварыце яшчэ... Вы ж не ведаеце, якая яна была.

Я не ведала. Хоць і ведала -- цэлую гадзіну здольная была яна расказваць пра яго: пра яго незвычайнасць, пра неабсяжнасць і безаглядасць яго натуры, пра яго дзівацтвы (гэтак здавалася іншым, збоку). Пра яго, пра яго, пра яго...

Але я званіла ёй па справе. Рэдакцыя павінна была падрыхтаваць адпаведныя рэкамендацыйныя паперы для перакладу Караткевічавай "Зямлі пад белымі крыламі" ў Літве і Славакіі. Яна выходзіла ў нашай рэдакцыі літаратуры для юнацтва ў выдавецтве "Мастацкая літаратура". Выходзіла -- заначу -- адразу не бесканфліктна. Не гладка. Былі спрэчкі. Была ўзаемная -- рэдакцыі і аўтара -- нязгода. Быў часам добра сапсаваны настрой.

НА ЗДЫМКУ: помнік У. КАРАТКЕВІЧУ ў Віцебску.

(Заканчэнне на 6-7 й стар.).

ВОДГУЛЛЕ

ДАКУЛЬ БУДЗЕМ ДОБРАНЬКІМІ?

Добры дзень, паважаныя землякі!

Прачытаўшы артыкул В.Чаркасавай "Барометр міграцыйнага надвор'я", хачу таксама выказаць свае меркаванні наконт гэтай праблемы, можа што і паспрыяе ў вырашэнні гэтага пякучага для ўсіх нас, замежных і незамежных беларусаў, пытання. Заадно хачу папрактыкавацца ў беларускім правапісе, бо рука так і круціць на расейскі манер. Мне балюча чытаць ці слухаць, калі нас, беларусаў ці рускіх, адусюль гоняць, як нейкі другасортны народ. У той жа самы час Беларусь прымае сотні і тысячы грамадзян тых рэспублік, з якіх былі выгнаны або ў выніку адкрытага шантажу прымушаны былі "паўзці з клункам па дарозе" нашы землякі, праклінаючы долю.

І пакуль гэта будзе, я ніколі не змагу назваць другам ці братам прадстаўніка таго народа, які зневажае маіх братоў і сясцёр!

Хопіць гнілой страусавай ідэалогіі! Нас б'юць, а мы прымаем іх у свае абдымкі, мы адкрываем свае дзверы для тых, хто нас не любіць і ніколі не любіў, а проста рабіў выгляд.

І вось яны едуць натоўпамі, усялякія бізнесмены, таргашы і іншыя нячыстыя на руку людзішкі, каб рабіць бізнес, а гэта значыць, грабіць нас. Што за рабская псіхалогія?! Табе далі па левай шчацэ, а ты падстаў і правую, і наогул хай пінаюць нас, затое па-біблейску -- ах, якія мы харошыя! Бачыце, як хораша пра нас гавораць і пішуць: ах, беларусы, ах, якія добранькія там жывуць дзядзі і цёці, усіх прымаюць!

Хачу, каб гэта пытанне хутчэй вырашалася на самым высокім узроўні, і чым хутчэй, тым лепей, а то здарыцца так, што беларус не будзе ў сваім уласным доме гаспадаром. Ды яно, мабыць, так і ёсць. У каго сувязі, грошы і нахабная, прабачце, рожа, той і гаспадар.

Вось коратка і ўсё, што хацеў выказаць, прачытаўшы гэты артыкул. Жадаю вам поспехаў ці проста кавалка хлеба на стале і трошкі рэальнага, бягучага з ЦЭЦ цяпла.

Віншую з Новым годам!

Няхай у наступным годзе засвецяцца, як лямпачкі, усмешкі на заклапочаных тварах усіх маіх землякоў!

Няхай жыве Беларусь!

З прывітаннем,
ваш вечны
паляшук-рамантык --
Анатоль БЕНЕДЗІКТОВІЧ.
Расія,
Набярэжныя Чаўны.

ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ

"Першапачатковыя ўмовы для рэфармавання Беларусі былі не горшыя, чым у іншых краінах. На жаль, мы зацягнулі з рэфармаваннем эканомікі, сістэмы ўлады. Адсутнасць абнаўлення ў кабінетах улады -- галоўная прычына нашай непаслядоўнасці, неэфектыўнасці рэформаў. Новы час, дынамічныя змены ў нашых суседзяў патрабуюць рашучага абнаўлення ўлады, прыходу да кіравання новых людзей -- прафесіяналаў з рынкавым мысленнем. Гэта павінны быць высокамаральныя палітыкі, якія не на словах, а на справе здольныя працаваць на карысць незалежнай Беларусі, здольныя стварыць умовы для свабоднай гаспадарчай дзейнасці беларускага народа.

У гэты цяжкі час, калі рэспубліка павінна зрабіць рашучы і нялёгкі крок да сацыяльнай рыначнай эканомікі, я яшчэ раз заклікаю ўсіх да ўзаемаразумення, разважлівасці і мудрасці. Хопіць катэгарычнасці, спрэчак, сварак. За імі -- канфлікт, выбух. Трэба падумаць аб будучыні нашага гаротнага народа. Вярхоўны Савет павінен выканаць сваё абяцанне народу і правесці ў надыходзячым годзе свабодныя, дэмакратычныя выбары".

(З навагодняга віншавання беларускаму народу Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава ШУШКЕВІЧА).

НОВЫ ПАШПАРТ

НАРЭШЦЕ ДАЧАКАЕМСЯ

Калі верыць кампетэнтным асобам, што праводзілі ў канцы снежня прэс-канферэнцыю, то грамадзяне Беларусі ўжо ў другім квартале 1994 года пачнуць атрымліваць новы пашпарт -- нацыянальны. У аснову яго пакладзена канцэпцыя адзінага пашпарта Рэспублікі Беларусь, пры захаванні дыпламатычных і службовых пашпартоў, а таксама пашпарта марака. Дыпламатычны пашпарт згодна з пастановай [illegible]іна рэспублікі будзе выдавацца народным дэпута[illegible] вышэйшаму кіраўніцтву рэспублікі, дыпламатам, дыпкур'ерам, а таксама супрацоўнікам Міністэрства замежных спраў, якія маюць дыпламатычныя рангі. Службовыя -- некаторым супрацоўнікам Савета Міністраў, Вярхоўнага Савета, міністэрстваў, ведамстваў і дзяржкамітэтаў. Усе астатнія грамадз[illegible]эспублікі атрымаюць агульнаграмадзянскі нацы[illegible]ьны пашпарт.

Цяпер аб законе.

Па-першае, да атрымання новага пашпарта кожны грамадзянін можа карыстацца агульнаграмадзянскім замежным пашпартам, у якім, праўда, павінна стаяць адзнака аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь.

У новым нацыянальным пашпарце кожны жадаючы зможа паставіць сабе выязную візу ў АВІРы па месцу жыхарства, незалежна ад таго, ці ёсць у грамадзяніна запрашэнне, пуцёўка ці іншы дакумент, які засведчвае неабходнасць выезду ў якую-небудзь краіну. Акрамя таго, тэрмін візы на выезд з рэспублікі будзе вызначаць той, хто выязджае. Па ўласнаму жаданню ён зможа аформіць выязную візу на тэрмін ад аднаго да пяці гадоў. Адпаведна афармленне візы будзе каштаваць у размерах адной мінімальнай зарплаты за адзін год. Што тычыцца перасячэння мяжы той краіны, у якую збярэцца патэнцыяльны ваяжор, то яно будзе ажыццяўляцца ў залежнасці ад стану адносін паміж Рэспублікай Беларусь і канкрэтнай краінай. Калі паездка ў якую-небудзь краіну запатрабуе афармлення выязной візы, то яе будзе афармляць пасольства пасля прад'яўлення якога-небудзь дакумента.

АКЦЫЯ МІЛАСЭРНАСЦІ

Сотні бадзяг атрымалі элементарную дапамогу ў час акцыі міласэрнасці "Чырвоны Крыж -- бяздомным". Гэтае мерапрыемства праведзена сумесна з органамі Міністэрства ўнутраных спраў ва ўсіх буйных гарадах рэспублікі. Бомжы, асобы без пэўнага месца жыхарства, атрымалі бялізну, якую закупіў Чырвоны Крыж на суму каля 500 тысяч рублёў, адзенне, сабранае ў жыхароў, і разавы талон на харчаванне, прайшлі санітарную апрацоўку. На ўсё мерапрыемства Чырвоны Крыж выдаткаваў 3 мільёны рублёў.



НА ЗДЫМКУ: работнікі таварыства Чырвонага Крыжа (злева направа) Ізольда СЯМОШЫНА, Таццяна АНТАНОВІЧ і Людміла МАРЦЬЯНАВА падбіраюць адзенне для бяздомнай.

ДЛЯ ВІЛЬНІ

ДАРЫ "БАЦЬКАЎШЧЫНЫ"

Аб'яднанне беларусаў свету "Бацькаўшчына" падарыла беларускім арганізацыям у Вільнюсе мемарыяльныя дошкі, прысвечаныя Янку Купалу, Кастусю Каліноўскаму, Браніславу Тарашкевічу і Рыгору Шырму. Дошкі будуць устаноўлены ў сталіцы цяперашняй Літвы ў памятных месцах, звязаных з беларускім адраджэнскім рухам. А зроблены яны мінскім скульптарам Алесем Мірончыкам.

СТАТЫСТЫКА

ЗА ЕЎРОПАЙ НЕ ЎГНАЦЦА

На сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваны 1 мільён 82 тысячы аўтасродкаў. Прыкладна адзін на дзесяць чалавек. Па еўрапейскіх мерках -- няшмат. У індывідуальным уладанні налічваецца 722 264 аўтамабілі. Сярод іх -- знак часу -- не толькі легкавыя, але і ўласныя грузавікі, аўтобусы. Самая папулярная марка аўтамабіля ў мінчан, зразумела, -- "Жыгулі". Згодна са статыстыкай ДАІ, іх у беларускай сталіцы налічваецца 72 445, "Масквічоў" амаль у два разы менш — 35 361, "Запарожцаў" — 17 626, "Волг" -- крыху менш за 5 тысяч, з іх трыццаць першай мадэлі -- усяго 78. Менш за ўсё аўтамабіляў "Ака" -- 95, "Іж-Арбіта" -- 13.

"Я ўжо гаварыў, што яна (унутрыпалітычная сітуацыя) складаная і супярэчлівая. Яе галоўная асаблівасць заключаецца ў тым, што абвешчаныя дэмакратычныя каштоўнасці і дасягненні не атрымалі заканадаўчага пацвярджэння. Не склалася дакладная схема раздзялення ўлад, што часта з"яўляецца крыніцай нестабільнасці і палітычнага процістаяння.

Узнікаюць і парадаксальныя сітуацыі, калі парасткі рыначнай эканомікі, якая яшчэ толькі-толькі фарміруецца, спр[illegible]юць зацніснуць у вожыкавыя рука[illegible] адміністравання, а з прадпрымальніцтвам, якое нараджаецца, пакончыць, як некалі з іншадумствам і дысідэнцтвам. Я маю на ўвазе нашумелыя даклады аб карупцыі.

Што ж адбылося? На маю думку, пэўныя сілы, свядома або несвядома, выка[illegible]стоўваючы даныя, што не атрымалі [illegible]дычнай ацэнкі, павялі наступленне на [illegible]макратыю, вырашылі падвергнуць рэвізіі працэс дэмакратычных рэформаў, павярнуць назад рыначныя пераўтварэнні. Левы і правы радыкалізм часам змыкаюцца, і тады дэмакратыі пагражае ахлакратыя, якая можа блакіраваць пераход рэспублікі да рынку, парушыць у грамадстве згоду, затармазіць працэс палітычных пераўтварэнняў у цэлым.

Вядома, усё гэта трэба асэнсаваць, аднак для многіх ужо сёння ясна, што ўраду, як і парламенту, неабходна больш грунтоўная прававая і канстытуцыйная абарона, імунітэт супраць таннага папулізму і дробязнага геройства".

(З выступлення Старшыні Савета Міністраў Беларусі Вячаслава КЕБІЧА на прыёме кіраўнікоў і супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў, акрэдытаваных у Мінску).

АДКРЫТЫ ЛІСТ

ГЕНЕРАЛЬНАМУ ПРАКУРОРУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

спадару В. ШАЛАДОНАВУ

СТАРШЫНІ КАМІСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСІ ПА АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ І ЗАХАВАННІ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ

спадару Н. ГІЛЕВІЧУ

МІНІСТРУ АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

спадару В. ГАЙСЁНКУ

У г. Мінску 14--16 снежня 1993 года праходзіла міжнародная канферэнцыя "Адукацыя XXI стагоддзя. Праблемы павышэння кваліфікацыі работнікаў адукацыі".

Аргкамітэт зацвердзіў рабочымі мовамі канферэнцыі рускую і ангельскую.

Тэзісы на дзяржаўнай мове не прымаліся, і тут жа прапаноўвалася падаваць іх толькі на рускай або ангельскай. Удалося дамагчыся з вялікімі маральнымі стратамі ўключэння (пасля адабрэння зместу даклада "Нацыянальная мова як аснова развіцця вышэйшай школы") тэзісаў майго даклада на дзяржаўнай (беларускай) мове. Мае тэзісы надрукаваны на беларускай мове.

Аднак выступіць на канферэнцыі з названым дакладам я не змог таму, што мае чатырохразовыя просьбы ў час работы канферэнцыі да яе арганізатараў прыняць рабочай мовай разам з рускай, ангельскай і беларускую былі праігнараваны намеснікам старшыні канферэнцыі рэктарам А. Жуком і прарэктарам па навукова-метадычнай рабоце інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі Б. Пальчэўскім.

У знак пратэсту супраць дыскрымінацыі правоў чалавека і непавагі да законаў Рэспублікі Беларусь я пакінуў работу секцыі № 5, якую ўзначальваў прафесар Б. Пальчэўскі.

У сябе на Радзіме, у сталіцы Беларусі, мяне пазбавілі права гаварыць аб прафесійных праблемах адукацыі XXI стагоддзя на дзяржаўнай мове.

Звяртаюся да вас, шаноўныя дзяржаўныя дзеячы Рэспублікі Беларусь: абараніце не столькі мае асабістыя правы, а правы цэлага народа, ад імя якога беларусы павінны мець магчымасць гаварыць на дзяржаўнай (для большасці яна ж і родная) мове.

Пытанне: да якой пары большасць кіруючых асоб (у нашым выпадку гаворка ідзе аб адукацыі) будуць груба, а ў асобых выпадках цынічна ігнараваць законы Рэспублікі Беларусь:

1. Артыкул 68, частка 4 Канстытуцыі Беларускай ССР: "Дзяржаўнай мовай Беларускай ССР з'яўляецца беларуская мова";

2. Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі, артыкул 1: "...дзяржава ўсталявала дзяржаўнасць беларускай мовы", артыкул 9: "...дзяржава забяспечвае функцыянаванне беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця";

3. Закон аб адукацыі, артыкул 6: "мовай выхавання і навучання з'яўляецца беларуская мова";

4. Закон аб мовах. Як вядома, з 1 верасня 1993 года ўведзены ў дзеянне ў поўным аб'ёме артыкулы 27" "Мова ў сферы навукі", 28 "Мова ў сферы культуры", 29 "Мова сродкаў масавай інфармацыі".

Старшыня Мінскай гарадской Рады таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны прафесар Мікола САВІЦКІ.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

ЧЫСТЫ грашовы прыбытак кожнага жыхара ў Беларусі за першую палову 1993 года склаў 13 554 рублі. Гэта ў параўнанні з 1990 годам больш у 81,8 раза. Але цэны ў параўнанні з тым жа перыядам падскочылі ў 129,9 раза.

У НАВАГОДНЮЮ ноч у Беларусі 27 чалавек скончылі жыццё самагубствам. А ўсяго было 106 ахвяр -- неасцярожнасць з агнём каля ёлкі, забойствы, няшчасныя выпадкі. Адбылося 149 крадзяжоў асабістай маёмасці і 66 -- дзяржаўнай уласнасці.

БОЛЬШ пяці тысяч беларускіх аўтамабіляў удзельнічае сёння ў міжнародных перавозках. Амаль з дзевяцісот дазволаў, якія даюць права на такую дзейнасць, трэць атрымалі дзяржаўныя прадпрыемствы, 120 -- фізічныя асобы, астатнія -- сумесныя і малыя прадпрыемствы, кааператывы.

Акрамя таго, міжнародныя перавозкі актыўна здзяйсняе чыгуначны і паветраны транспарт рэспублікі.

ТОЛЬКІ 220 рускіх, якія жывуць у Беларусі, звярнуліся ў пасольства Расійскай Федэрацыі ў Мінску з просьбай аб расійскім грамадзянстве. Асноўная прычына -- уз"яднанне з сем"ямі. На тэрыторыі Беларусі пражывае каля 1,5 мільёна рускіх. Яны не рвуцца ў Расію.

ЯК СТАЛА вядома карэспандэнту РІДа, 270 мільёнаў долараў ЗША можа атрымаць у 1994 годзе Рэспубліка Беларусь за прагон па яе тэрыторыі газу і нафты ў замежныя краіны.

Па апошніх даных, праз газа- і нафтаправоды рэспублікі штогод перапампоўваецца 17 мільярдаў кубаметраў газу і 56 мільёнаў тон нафты.

Месяц назад у Рызе адбылося вялікае свята -- латвійскія беларусы ладзілі вечарыну, прысвечаную 100-м угодкам ад дня нараджэння выдатнага дзеяча беларускага Адраджэння ў Латвіі Кастуся Езавітава, а заадно і 5-ю гадавіну заснавання таварыства "Світанак". Мусім прасіць прабачэння ў чытачоў за спознены рэпартаж аб падзеі, але сталася тое не з нашай віны: цяпер дачакацца ліста з Латвіі -- тое ж, што і з Амерыкі. Пошта працуе надта ж марудна. Але нататкі, дасланыя з Латвіі, не згубілі сваёй актуальнасці. Вы прачытаеце іх у імгненне і, можа, пазайздросціце, як і мы, што не былі на той урачыстасці ў рыжскіх беларусаў.

ХРОНІКА АДНАГО ДНЯ "СВІТАНКА"

АДЧУЦЬ СЯБЕ БЕЛАРУСАМ

4 снежня 1993 года. Раніца. У самым цэнтры латвійскай сталіцы над будынкам Саюза пісьменнікаў Латвіі (дом Беніяміна), што на вуліцы Кр. Барона, 12, уздымаецца бел-чырвона-белы сцяг Рэспублікі Беларусь. Гэта Латвійскае таварыства беларускай культуры "Світанак" ладзіць святочную вечарыну з нагоды дзвюх гадавін: 100-х угодкаў з дня нараджэння вядомага дзеяча беларускай культуры Латвіі, педагога, вучонага, паэта, публіцыста, дыпламата, міністра першага ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі Кастуся Езавітава і 5-годдзя Латвійскага таварыства беларускай культуры "Світанак".

Кіруюць вечарынай сапраўдныя вядучыя, навучэнцы Рыжскай беларускай нядзельнай школы Наталля Косціна ды Юрый Ярчак. Дзею пачынаюць артысты той жа школы і дзіцячай мастацкай студыі "Вясёлка".

Нягледзячы на сціплы артыстычны ўзрост і скіраваныя на іх камеры тэлебачання і мікрафоны Латвійскага радыё, хвалявання ў маладых артыстаў амаль непрыкметна. На тварах дзетак гонар, радасць і шчасце за магчымасць данесці прыгажосць і мілагучнасць роднай мовы да ўсёй Латвіі. Свята працягваецца.

Нарэшце слова атрымліваюць дарослыя. З прывітаннем да прысутных звяртаецца старшыня Саюза пісьменнікаў Латвіі паэт Віктар Авотыньш.

Аб Кастусю Езавітаве распавядаў даўні сябар "Світанка", паэт і публіцыст з Мінска, спадар Сяргей Панізьнік. Дарэчы, перад пачаткам вечарыны адбылася прэзентацыя яго кнігі "Дзеці вайны", працяг раней надрукаванай "Асвейскай трагедыі" аб лёсах беларукіх дзяцей, вывезеных у часы нямецкай акупацыі з Беларусі ў Латвію.

Аб сваіх даследаваннях таленту Кастуся Езавітава ў справе народнай асветы беларускага насельніцтва Латвіі распавядала доктар гістарычных навук спадарыня Ілга Апінэ.

Успамінамі аб знакамітым юбіляры дзеліцца дачка паплечніка К. Езавітава, беларускага педагога і фалькларыста Сяргея Сахарава, Ірына Вількель.

Паступова аб'ектам увагі становіцца сам "Світанак". Латвійскае таварыства беларускай культуры "Світанак" -- культурна-асветніцкае таварыства, распавядае старшыня таварыства, доктар хімічных навук Мікалай Ярчак.

Галоўным кірункам дзейнасці таварыства з'яўляецца адраджэнне нацыянальнай свядомасці сярод беларускага жыхарства Латвіі, далучэнне да беларускай культуры, мовы, гісторыі.

У гэтым напрамку ўжо зроблены першыя крокі. Другі год працуе Рыжская нядзельная беларуская школа, дзе дзеці вывучаюць родную мову і гісторыю Беларусі. Чатыры гады таму назад адчыніла дзверы мастацкая студыя "Вясёлка", якой кіруе прафесійны мастак Вячка Целеш. Амаль тры гады ў Рызе працуе беларуск[illegible] бібліятэка "Світанак". Выйша[illegible] свет першы нумар часопіса "Світанак", рэдактар якога Сяргей Кузняцоў. Дарэчы, да 100-х угодкаў з дня нараджэння К. Езавітава таварыства выпусціла паштоўку.

Таварыствам ладзіліся навуковыя канферэнцыі, сустрэчы са знакамітымі людзьмі Беларусі і Латвіі, адзначаліся святочныя дні.

Не абышлося і без віншаванняў. Прыйшла вельмі цёплая тэлеграма ад старшыні Сейма Латвійскай Рэспублікі спадара Анатоля Гарбунова.

З прывітальнымі словамі выступілі: Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Латвіі спадар Валянцін Вялічка, прадстаўнік Міністэрства юстыцыі Латвіі Лілія Савіч, прэзідэнт Асацыяцыі прадпрымальнікаў-беларусаў Латвіі "Беларускі шлях" і гандлёвага дома "Беларусь" спадар Іван Кабановіч, сябар Рады Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў спадарыня Мірдза Абола, намеснік старшыні Міжнароднай супольнасці мастакоў "Маю гонар" Ларыса Лойка. Паэт С. Панізьнік зачытаў віншаванні ад Саюза пісьменнікаў Беларусі, ад Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, ад рэдакцыі навукова-метадычнага часопіса Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь "Роднае слова" ды і ўласныя віншаванні.

Ужо чацвёртую гадзіну запар ішло святкаванне, але ўсё гэта ляцела як адно імгненне. Ні адзін чалавек з перапоўненай залы не пакінуў яе нават на хвіліну. Вечарына працягвалася. За раялем беларускі кампазітар Уладзімір Буднік. Забягаючы наперад, трэба адзначыць, што папрацаваць яму ў той вечар давялося вельмі шмат. Бо пасля заканчэння афіцыйнай часткі каля раяля сабраліся дзеці і дарослыя, каб паспяваць і патанцаваць пад музыку земляка з Мінска.

А ў зале тым часам тварыўся сапраўдны цуд. Стаіўшы дыханне ўдзельнікі святаў слухалі спявачку, выканаўцу аўтарскіх песень Касю Камоцкую. Нягледзячы на незразумелую мову, супрацоўнікі Латвійскага радыё былі так уражаны талентам спявачкі, што змаглі заrганізаваць на наступны, непрацоўны дзень запіс на студыі. А яшчэ праз дзень ужо ўся Латвія дакранулася да здабыткаў таленту -- слухала чароўны голас Касі Камоцкай.

У заключэнне старшыня "Світанка" адзначыў вялікую падтрымку дзейнасці таварыства з боку дзяржаўных устаноў Латвіі і Беларусі, фірмы "Віцьна" з Бабруйска, асацыяцыі прадпрымальнікаў-беларусаў "Беларускі шлях" і гандлёвага дома "Беларусь" з Рыгі.

Вечарына набліжалася за заканчэння. Пад схіламі Залатой залы гучала беларуская музыка, песні. Завяршаўся працоўны дзень "Світанка". Час быў позні, і трэба было развітвацца.

Найкаштоўнейшым падарункам, атрыманым "Світанкам" у гэты дзень, была шчырая падзяка, якую са слязьмі на вачах выказвалі людзі. Бо яны зноў адчулі сябе часцінкай роднай Беларусі, яны адчулі сябе беларусамі.

Лявон АРАБЕЙ.



НА ЗДЫМКУ: паштоўка, выпушчаная да 100-годдзя К. Езавітава Латвійскім таварыствам беларускай культуры "Світанак".

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

У Еўропе ў апошнія 2-3 гады зноў пачынаюць адраджацца сацыялістычныя ідэі. Яны ачышчаюцца ад камунізму, ад розных таталітарных плыняў. Перамога сацыялістаў у Іспаніі, у Грэцыі, у Літве і Польшчы паказала, што на чарговым вітку развіцця грамадства сацыялізм зноў апаноўвае розумы людзей. Дарэчы, і ў Германіі таксама можна прадказаць перамогу сацыял-дэмакратаў.

— Алег Анатольевіч, мы ўсё блукаем па Еўропе і там знаходзім прывабную мадэль сацыялізму. А я хацеў бы пачуць ад вас, што вы думаеце пра наш сацыялізм, які "почил в бозе".

— Вядома ж, мы адчуваем сябе напружана. Гэтыя людзі былі

І ЎСЁ Ж САЦЫЯЛІЗМ. АЛЕ ЯКІ?..

-- "Почил в бозе" не сацыялізм, а яго выродная практыка. І форма таксама -- ідэалогія. Возьмем нашых папярэднікаў сацыялістаў-грамадаўцаў...

— У іх нават у назве партыі была рэвалюцыйнасць і сацыялізм.

-- Так, Беларуская рэвалюцыйная Грамада, Беларуская сацыялістычная Грамада... Але ж яны бачылі сацыяльнае салідарнае грамадства зусім не такое, як бальшавікі. На першае месца ставілі нацыянальную ідэю, раўнапраўе форм уласнасці. Яны ж нідзе не выказваліся за тыя структуры, якія былі потым збудаваны — за тое, каб у сялян адабраць зямлю і загнаць іх у калгасы. Адзін з тых выдатных сацыялістаў, Якуб Колас, пісаў пра "[illegible]ы кут" для селяніна -- ка[illegible]к уласнай зямлі. Гэта ж был[illegible] мэта жыцця.

А бальшавікі збудавалі нават не феадалізм, а самы сапраўдны рабаўласніцкі лад. З рэлігіяй фараонаў, дзе мумія была ў маўзалеі і ёй маліліся і пакланяліся. З п[illegible]следаваннем хрысціянства, [illegible]ой рэлігіі, разбурэннем і [illegible]аганьваннем храмаў. З ГУЛАГам.

І вось наша мэта, мэта нашай партыі — вярнуцца да вытокаў, да пачатку XX стагоддзя. Дамагчыся прыватнай уласнасці на зямлю, ды каб кожны грамадзянін Беларусі не толькі меў фармальныя правы на зямлю, але і мог іх рэалізаваць. Бо калі ў чалавека будзе "свой кут", свая хата, вырасце моцны сярэдні клас. І тады наша грамадства стане сацыялістычным у поўным сэнсе слова.

— Вось вы сказалі: "Вярнуцца да вытокаў..." Вярнуліся. БСДГ -- гэта ўжо было і сталася гісторыяй. Вы рашылі аднавіць партыю і з гісторыі зрабіць жывую сучаснасць. Ці думалі вы перад тым, як абвясціць аб арганізацыі Грамады на старых падмурках, што ў адну і тую ж раку нельга ўвайсці двойчы?

— Думалі, але мы добра ведалі, што нішто так не захапляе людзей, як добра забытае старое. Мы не збіраемся другі раз уваходзіць у тую ж раку, а проста хочам плысці далей па гэтай рацэ пасля таго, як на ёй узарвалі плаціну. У свой час кнорыны ды мяснікяны паставілі моцную плаціну на плыні беларускага нацыянальна-дэмакратычнага адраджэння. Яе ўдалося ўзарваць толькі ў 1991 годзе. Але на гэтай рацэ засталося яшчэ многа парогаў. Наша задача — расчысціць рэчышча і ад гэтых парогаў.

Я лічу, што ідэі нашых папярэднікаў зразумелыя людзям і зараз. Вазьміце праграму Грамады 1917 года. Хіба мы дамагліся зямлі сялянам? Не! Ці рабочыя -- гаспадары на сваёй фабрыцы? Нічога падобнага! Там гаспадар — "чырвоны дырэктар".

— Таксама, як у калгасе: там гаспадар -- "чырвоны князь" у асобе старшыні...

-- Так. У нас створаны клас рабаўласнікаў, якія залежаць ад фараона. Раней ім быў генеральны сакратар...

Людзі, якім баліць за Бацькаўшчыну, павінны зразумець, што ідэі сацыял-дэмакратыі -- гэта вельмі моцныя ідэі. І калі мы хочам збудаваць шматпартыйную сістэму ў дэмакратычным грамадстве, то сацыял-дэмакратыя павінна заняць у ім вельмі важнае месца. Хай будуць разам з намі і лібералы, і хрысціянскія дэмакраты, і чыста нацыянальныя партыі. Мы гатовы супрацоўнічаць з усімі. Нам толькі не па дарозе ні з шавінізмам, ні з камунізмам.

-- Як вы, грамадаўцы, адчуваеце сябе пад ценем вашых вялікіх (думаю, што маем права іх так называць) папярэднікаў? Не баіцеся драбнаты думак і спраў? Час жа і людзі цяпер іншыя.

— Вядома ж, мы адчуваем сябе напружана. Гэтыя людзі былі дастойнымі таго, каб пра іх не забыць і ў XXI стагоддзі. Але менавіта мы і адраджаем іх для народа, для Бацькаўшчыны. Грамада ладзіць на пачатку лютага вечарыну ў Доме літаратара, прысвечаную 110-й гадавіне з дня нараджэння А.Луцкевіча. У канцы мінулага года мы аддалі належнае памяці В.Ластоўскага.

Мы ўзялі на сябе абавязак: адрадзіць, ачысціць ад бруду імёны славутых дзеячаў Грамады, абылганыя бальшавікамі, затаптаныя ў гразь рознымі касмапалітамі ды шавіністамі. Наша мэта -- вярнуць іх у беларускую гісторыю, у беларускую палітыку. Таму мы як бы разам з імі. Семдзесят савецкіх год трэба забыць, як нейкі кашмарны сон. Але гісторыю трэба і памятаць: гэта можа зноў паўтарыцца. Атрымалася так, што плаціну ўзарвалі і гэты бруд паплыў па рацэ. І чым хутчэй плынь ачысціцца, тым хутчэй мы станем жыць у нармальнай дзяржаве.

Нашы папярэднікі накладваюць на нас і вялікія абавязкі. Але я вам скажу, што апошні прыём у нашу партыю паказаў, што ў Грамаду ўступаюць людзі, якія могуць прэтэндаваць на пэўную ролю ў грамадстве. Адзін з вядомых грамадаўцаў Адам Мальдзіс. Гэта фігура не горшая за тыя, якія былі тады. Ці Сцяпан Сокал, былы старшыня Саюза юрыстаў, доктар навук, прафесар. Альбо Міхась Біч, вядомы беларускі гісторык. Зараз уступіў у партыю Уладзімір Сосна, адзін з нашчадкаў тых вядомых дзеячаў: яго дзед і прадзед былі ля вытокаў адраджэння. На апошнім пленуме ўступіла ў БСДГ два дактары навук і восем кандыдатаў. Не сумняваюся: чым бліжэй да выбараў, тым хутчэй шэрагі партыі будуць расці. У партыі шмат прыхільнікаў, але па многіх прычынах яны пакуль не ўступаюць у Грамаду. Адчуваецца ганенне на гэтых людзей, асабліва, калі яны займаюць высокія пасады. Таталітарная сістэма яшчэ чапляецца.

— Ваш ідэал, як і старой Грамады, — "роўнае багацце, а не роўная беднасць". Цудоўны ідэал! Але ці ажыццявімы ён у варунках таго дзікага спекулятыўнага рынку, які мы маем сёння? На нашых вачах буяе цынічная раскоша сучасных нуворышаў і галеюць людзі шчырай, сумленнай працы.

— Гэты ідэал вельмі актуальны сёння, з ім можна будзе перамагчы на выбарах. Па нашых прагнозах, самае малое — 10 працэнтаў галасоў на наступных выбарах у парламент БСДГ атрымае. А калі мы прыйдзем да ўлады, то праз 1-2 месяцы ўсё нажытае несумленна, нарабаванае, вернецца народу. Прычым мы не будзем дзейнічаць бальшавіцкімі метадамі, займацца экспрапрыяцыяй. Мы зробім гэта нармальным, законным шляхам — праз сістэму падаткаабкладання.

Яшчэ раз скажу: наша мэта — стварыць моцны сярэдні клас. Усёй сваёй дзейнасцю БСДГ будзе спрыяць гэтаму.

Гутарку вёў Вацлаў МАЦКЕВІЧ.

ПАГАВОРЫМ ПА ШЧЫРАСЦІ

Мікола ЕРМАЛОВІЧ:

"НАЦЫЯНАЛІЗМ, ЯК І ШАВІНІЗМ, – ПРЫКМЕТА СЛАБАСЦІ НАРОДА"

З ВЯДОМЫМ ГІСТОРЫКАМ Мікола ЕРМАЛОВІЧАМ ГУТАРЫЦЬ Анатоль ЛІТВІНОВІЧ

— Мікола Іванавіч, вось вы не так даўно ў часопісе для дзяцей сцвярджалі, што беларусы — гэта адзін з моцных народаў у Еўропе. Ну, пра гэта сведчыць і гісторыя, і наяўнасць сваёй дзяржаўнасці, і культура, і г.д. І калі параўнаць уклад беларусаў і жамойцаў у сусветную навуку, тэхніку і культуру, дык наш уклад будзе непараўнальна большы, чым іхні. Аднак жамойцы лепш захавалі сваю культуру і мову, значыць, яна ў іх была мацнейшая і больш багатая, чым наша. Аднак, як мы ведаем, было наадварот. Чым гэта ўсё можна растлумачыць?

-- Мы ж таксама захавалі сваю мову. Прычым, як гэта ні дзіўна, наша літаратурная мова, асабліва ў апошнія дзесяцігоддзі, нягледзячы на тое, што ўвесь час яна фактычна вынішчалася, развівалася і дасягнула выключна высокага ўзроўню. У той жа час, калі яна расла ўверх, то яе адсякалі ўнізе -- не давалі магчымасці пашырацца. Трэба ведаць, што літоўцы і латышы — гэта народы рэліктавыя, і такія народы, адчуваючы, што могуць знікнуць, маюць крыху мацнейшае пачуццё самаабароны, самазахоўвання. Аднак нацыяналізм — гэтак жа сама, як і шавінізм, з'яўляецца аднолькава прыкметай слабасці таго ці іншага народа. Шавінізм — гэта прыкмета слабасці вялікага народа, які, адчуваючы, што ён ужо не можа ўтрымліваць пад сваёй уладай іншыя народы, кідаецца ў шавінізм. Для малых народаў нацыяналізм з'яўляецца паказчыкам таго, што яны не ўпэўнены ў сваім далейшым лёсе і таму кідаюцца, я сказаў бы, у такі аднабаковы нацыяналізм. Нацыяналізм -- паняцце неадназначнае. Лічу, што нацыяналізм як сродак адстойвання сваёй самастойнасці -- прагрэсіўная з'ява. Калі нацыяналізм з'яўляецца прыкметай замкнутасці ў саміх сабе, ён можа прывесці да гібелі народа. Беларусаў падганяюць пад чужыя меркі. У нас зусім іншы характар, чым, напрыклад, у грузінаў, армян і некаторых іншых народаў. Можа, у тым і сіла наша, беларусаў, што мы паважаем іншых, ужываемся з імі. Колькі ў нас было і высялялася розных расейцаў, палякаў, валынян, латышоў, літоўцаў, мазураў, кашубаў — усе яны сталі беларусамі. Іх да гэтага не прымушалі. Яны падначаліліся беларускаму культурнаму ўплыву, засвоілі беларускую культуру і мову. Аднак часам, магчыма, і захоўвалі нейкія свае звычаі. Гэтыя звычаі толькі ўзбагачалі этнічную палітру нашага народа. У свой час Шахматаў лічыў, што на тэрыторыю Беларусі выселілася вялікая колькасць сербаў. І сапраўды, многія назвы гавораць пра тое, што тут, відаць, некалі былі сербы. Напрыклад, такія назвы, як Радашкавічы, Алёхнавічы, — гэта народныя назвы. Горад Косаў у Брэсцкай вобласці. У многіх прозвішчах націск падае на першы склад. І вось асабліва яркі паказчык: адкуль у беларусаў з'явіўся танец "Сербіянка"? Відаць, яго танцавалі сербы, а пасля гэты танец стаў здабыткам беларусаў, аднак назву сваю захаваў.

-- Многія беларусы маюць прозвішчы, агульныя з сербскімі, напрыклад, Косіч, Струпеніч, Мініч, Прыгодзіч і шмат іншых.

-- Так, так, суфіксы многіх прозвішчаў у нас і сербаў агульныя. Вельмі добра сказаў Качубінскі, што беларусы без шуму і гвалту асімілёўвалі літоўцаў. І не толькі літоўцаў, але і іншыя плямёны. Што з'яўляецца зброяй асіміляцыі народа, асабліва ў сучасны момант? Гэта царква, школа, дзяржаўная ўлада. З дапамогай іх ішла і паланізацыя, і русіфікацыя. Аднак беларусы, страціўшы сваю дзяржаўнасць, тым не менш працягвалі асіміляцыю літоўцаў, не маючы ні сваёй дзя[illegible]ы, ні прэсы, ні царквы, ні [illegible]олы. Гэта гаворыць аб моцы беларускага народа. Самі беларусы, будучы аб'ектам паланізацыі і русіфікацыі, у той жа час пашыралі сваю этнічную тэрыторыю і сваё насел[illegible]ва.

-- Я раней [illegible]таксама, як і вы, думаў, але ў апошні час свае думкі ў адносінах да беларускага, жамойцкага і латышскага народаў крыху змяніў. Верагодна, асіміляцыя жамойцаў XIX -- пачатку XX стагоддзяў абумоўлена ўсё ж і гістарычнымі, палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі, культурнымі і іншымі ўмовамі іх жыцця, інтэнсіўным развіццём капіталізму на беларускіх землях, цесным узаемадзеяннем жамойцаў з беларусамі. І нарэшце не менш важнае -- этнічнай блізкасцю. На маю думку, абеларушчванне жамойцаў у мінулым -- пачатку нашага стагоддзяў было ўжо прадвызначана ў папярэднія стагоддзі. У сувязі з тым, што Вялікае Княства Літоўскае было фактычна беларускай дзяржавай, вярхі жамойцкага грамадства XIV—XVII стагоддзяў паступова прымалі нашу мову, звычаі, культуру, карацей кажучы, абеларушчваліся: гэта ж амаль да канца XVII стагоддзя наша мова была для жамойцкіх феадалаў і шляхты афіцыйнай, прэстыжнай і фактычна роднай.

— Мікола Іванавіч, у цяперашні час многія беларускія дзеячы, у прыватнасці, прадстаўнікі БНФ, апазіцыі ў парламенце арыентуюцца ў сваёй палітыцы на Цэнтральную і Паўночную Еўропу, у прыватнасці, на Германію. І, відаць, не без падстаў, таму што нямецкі фактар у гісторыі і культуры беларускага народа адыграў вялікую ролю. А тут яшчэ значэнне мае блізкасць беларускай культуры, тэмпераменту, характару, традыцый да культуры, тэмпераменту, ментальнасці нямецкай. Яшчэ Міхал Федароўскі пісаў, што сярод славянскіх народаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы беларус найбліжэй стаіць да немца (тут вучоны, відаць, меў на ўвазе блізкасць беларускага і нямецкага тэмпераменту, характару, якасцей (працавітасць), у пэўнай ступені у іх існуе падабенства светапогляду (у абодвух народаў дзяржаўная ўлада мае значны ці вялікі аўтарытэт), шляхоў развіцця культуры. Усё гэта сведчыць пра тое, што мы блізкія з немцамі зусім не выпадкова.

— Беларусы шмат чаго засвоілі з еўрапейскай, у прыватнасці, нямецкай культуры. Гэта ўзбагаціла іх нацыянальны характар, культуру ў многіх адносінах. Мы знаходзіліся ў еўрапейскай сям'і, калі ў нас было Вялікае Княства Літоўскае. Тады, калі Беларусь далучылі да Расіі, яна была фактычна адарвана ад Еўропы, перарвалася традыцыя, хаця поўнасцю і не знікла. Збліжэнне з Заходняй Еўропай, а гэта значыць і з немцамі, будзе мець станоўчае значэнне. Аднак гэта не азначае нівеліроўкі нашага народа. Гэта не значыць, што ён паддасца масавай культуры, якая зараз ідзе з Захаду і актыўна засвойваецца нашай моладдзю. Я лічу, што гэта часовая з'ява, што мода пройдзе, што беларусы, нягледзячы на збліжэнне з Захадам, зберагуць сваю нацыянальную самабытнасць.

-- А ці можаце вы пагадзіцца з думкай, што нямецкі ўплыў у папярэднія стагоддзі нейтралізаваў у пэўнай ступені польскі ўплыў на Беларусі?

-- Наадварот, менавіта тое, што Польшча траціла свае заходнія землі ў карысць немцаў, і стымулявала імкненне палякаў падначаліць сабе слабейшыя ўсходнія землі, землі Вялікага Княства Літоўскага. Вось што было галоўнай прычынай заключэння Крэўскай уніі. Яны імкнуліся кампенсаваць свае страты на Захадзе набыткамі на Усходзе. Немцы, наадварот, сваёй агрэсіўнай палітыкай паявлічвалі польскі націск на Беларусь.

-- Ці можна сур'ёзна гаварыць пра польскае пытанне на Беларусі? Ці ж можна за асобную нацыянальную меншасць лічыць так званых палякаў на тэрыторыі нашай рэспублікі? Яны ж па антрапалогіі (у тым ліку групах крыві), тэмпераменту, характары, ментальнасці, норавах, знешняй культуры, а галоўнае — мове і фальклоры (гэта можна давесці на падставе моўных і фальклорных даных) — тыповыя беларусы. Бясспрэчна, у нас маюцца і сапраўдныя палякі, аднак на Беларусі іх мізэрная колькасць. Толькі сапраўдныя, этнічныя палякі маюць права на свае дзіцячыя садкі, школы, нацыянальна-культурныя арганізацыі і да т.п., а навошта ж з беларусаў-католікаў рабіць палякаў? Ясна, што ў пераважнай большасці беларускіх католікаў нічога польскага няма. Нягледзячы на тое, што частка нашых католікаў па шэрагу гістарычных, канфесійных і іншых прычын лічаць сябе палякамі, мы павінны вельмі цярпліва і настойліва тлумачыць, што яны дзеці адной маці -- Беларусі, што іх продкі ніколі не пераязджалі з этнічна польскіх земляў.

-- Гэта так, і да ўсяго трэба сур'ёзна аднесціся. Едуць да нас польскія святары, ксяндзыпалякі, яны і будуць весці польскую палітыку. Ды і ўся гісторыя паказвае, што фактычна пашырэнне каталіцызму было галоўнай дарогай пашырэння польскай экспансіі на Беларусі. Таму і зараз менавіта праз касцёл і будзе ісці польская прапаганда ў галовы нашага народа, асабліва католікаў, будзе ўвесь час укараняцца гэта ідэя: "Раз ты католік, значыць -- ты паляк". І я лічу, на пагрозу паланізацыі нам трэба звярнуць вялікую ўвагу. Сапраўды, у нас ёсць гэта пагроза паланізацыі, як, дарэчы, і русіфікацыі.

-- Мікола Іванавіч, у апошні [illegible] на старонках "Нашай нівы" [illegible]шчаюцца палітычныя артыкулы жамойцкіх даследчыкаў, у якіх яны выказваюць сваё незадавальненне тым, як беларускія даследчыкі, журналісты і чытачы ў розных выданнях называ[illegible] цяперашнюю Летуву і яе [illegible]кароў. Жамойцкія мовазнаўцы выказваюцца катэгарычна супраць атаясамлення паняццяў "Літва", "ліцвін" з паняццем "Беларусь", "беларус". Асабліва дасталася кнізе Я. Шыраева "Русь Белая, Русь Черная и Литва в картах" (М., 1991). Яны не згодныя з вывадамі гэтай працы ў тым, што "понятия "Литва" и "литовский" в те времена соответствовали современным понятиям "Белоруссия" и "белорусский"; "...название "Литва" правомернее относить к белорусскому этносу, чем к литовскому"; "... белорусский этнос сохранил до XX в. само название края "Литва" (не "Летува", с. 10). На іх думку, "тапонім Lietuva ведамы ад пачатку XI стагоддзя, г.зн. ад тых часоў, калі самастойнае беларускае нацыянальнасці і мовы яшчэ зусім не было. Няпраўда й тое, што да XX стагоддзя беларусы называлі сябе "литвины". Папраўдзе беларусы ніколі сябе так не называлі. Назовы "Историческа Литва", "литвины" ўжываліся ў расейскім гістарычным і афіцыйным друку XIX стагоддзя. Калі пачала фармавацца беларуская нацыянальная свядомасць, беларусы-праваслаўныя называлі сябе рускімі, а беларусы — католікі і уніяты -- палякамі".

Далей жамойцкія мовазнаўцы сцвярджаюць: "Сувязь этнонімаў Lietuva і Litva можа быць вытлумачана толькі, калі прызнаць, што першаснаю формаю ёсць Lietuva. З формы Litva ніякім чынам не магла ўзнікнуць Lietuva, а ад Lietuva натуральна ўтварылася Litva... Litva — гэта вынік заканамернае адаптацыі ва ўсходнеславянскіх мовах балцкага тапоніма Lietuva -- відавочны, бясспрэчны, падтрыманы хрэстаматыйнымі фактамі". Вось так яны пішуць. А што вы можаце сказаць па гэтым пытанні?

-- Па-першае, аўтары гэтага артыкула ўводзяць у зман чытачоў, калі гавораць, што першае ўпамінанне Літвы ў 1009 годзе дадзена ў форме "Летува". Якраз наадварот, менавіта там гэта назва прыведзена як "Літва". І там сказана, што каталіцкага прапаведніка забілі на сумежжы Літвы і Русі, г. зн., што тая Літва, якая ўпамінаецца там, межавалася з Руссю, г.зн. не сучасная, а тая Літва, якая была ў Верхнім Панямонні на тэрыторыі Беларусі. Відаць, адсюль, з тэрыторыі беларускага Панямоння, пераходзячы на тэрыторыю сучаснай Літвы, набыла форму Летува. Па-другое, аўтары гэтага артыкула лічаць, што беларуская нацыянальная самасвядомасць пачала фармавацца толькі ў XIX стагоддзі. Яны забываюць, што на тэрыторыі Беларусі існавалі беларускія дзяржаўныя ўтварэнні, такія, як Полацкае, Тураўскае, Навагародскае княствы, і, вядома ж, без нацыянальнай свядомасці не маглі існаваць у гэты час. Менавіта таму, што ўласна Літва (пачатковая Літва) знаходзілася на тэрыторыі Беларусі, таму і насельніцтва гэтай тэрыторыі ў далейшым называлася ліцвінамі. Поўная аналогія з Прусіяй. І назва Літва не мае абсалютна ніякага дачынення да назвы Летува. Назву ліцвіны нельга атаясамліваць з назвай літоўцы. Наконт таго, ці патрэбна называць літоўцаў летувісамі, дык калі самі жыхары Летувы так сябе называюць, то, верагодна, можна іх так называць.

— Ці згодны вы са сцвярджэннем навукоўцаў, што беларусы сябе ніколі не называлі ліцвінамі?

— Як гэта не называлі? Няхай пачытаюць адзін з твораў Георгія Каніскага, у якім паказаны герой пад імем ліцвін, што гаворыць на беларускай мове. Вазьміце трылогію Я.Коласа "На ростанях", у якой пан падлоўчы называе сябе ліцвіном і гаворыць на добрай беларускай мове. Ёсць і іншыя прыклады. Кастусь Каліноўскі, які быў родам з Беларусі і які дзейнічаў на яе тэрыторыі, называе сваю радзіму ў асноўным Літвой.

-- Вось вы пішаце, як і дзесяткі беларускіх гісторыкаў, што Вялікае Княства Літоўскае было беларускай дзяржавай, аднак зусім па-іншаму асвятляюць нашу мінуўшчыну аўтары школьнага падручніка "Гісторыя Беларусі" (Мн., 1993) М.Баранава, Э.Загарульскі, Н.Паўлава, у якім яны зноў паўтараюць тую думку, як і дзесяць, дваццаць, трыццаць год таму, аб літоўскай заваёве беларускіх земляў. Што гэта: ігнараванне сучасных прац па гісторыі Беларусі, ці няведанне іх (у гэта цяжка паверыць), або наўмыснае замоўчванне праўдзівых гістарычных фактаў, найноўшых канцэпцый па гісторыі Беларусі?!

-- Справа ў тым, што яны, гаворачы аб літоўскім заваяванні Беларусі, не прыводзяць ніводнага факта заваявання. Вось калі яны прывядуць хоць адзін такі факт заваявання хоць адной якой-небудзь беларускай зямлі Літвой, тады я згаджуся з імі.

-- Вялікі дзякуй за інтэрв'ю, Мікола Іванавіч. Жадаю вам творчых поспехаў на карысць беларускай навукі.

Заканчэнне. Пачатак у № 1.

Роспуск Вярхоўнага Савета і з"езда народных дэпутатаў, блакада "Белага дома", разгром мэрыі і напад на тэлецэнтр, нарэшце штурм з прымяненнем танкавай артылерыі акружаных заканадаўцаў і іх прыхільнікаў — усё гэта завязана ў адзін прычынна-следчы вузел. Ход падзей з часам праясніцца. Але ўжо цяпер перад беларускімі заканадаўцамі і народам паўстае пытанне: ці мэтазгодна ўводзіць у рэспубліцы прэзідэнцкае праўленне, блізкае амерыканскаму ўзору, дзе ў грамадстве існуюць палітычная і сацыяльна-эканамічная стабільнасць, усталяваная двухпартыйная сістэма, адносна высокая прававая культура грамадства.

У друку з"явіліся публікацыі прыхільнікаў увядзення ў Беларусі парламенцкай рэспублікі. Мы чуем іх аргументы і з тэлеэкрана.

ГІСТОРЫЯ БЕЗ ІДЭАЛІЗАЦЫІ

БНР — БССР — РБ, або ПАЛЕМІЧНЫЯ НАТАТКІ З НАГОДЫ ЮБІЛЕЮ

12. З ГІСТОРЫІ НІЧОГА НЕ ВЫКІНЕШ

І ў мінулым, і цяпер няма недахопу ў закліках праўдзіва асвятляць вопыт народа і з павагай ставіцца да гістарычнай спадчыны. Але практыка дае прыклады іншага тыпу. Бальшавікі ацэньвалі спадчыну мінуўшчыны з пазіцыі класавасці і ўзаконеных на гэтай падставе ідэалагічных пастулатаў. Часам гэта прымала крайне адыёзныя формы. Разбурэнне храмаў, бадай, не самы апошні вынік такіх поглядаў. І ў наш час, час галоснасці і палітычнага плюралізму, нямала прыкладаў выключэння з "гістарычнага рэестра" ідэалагічна непажаданых фактаў і падзей.

Возьмем каляндар "Наш край" на 1993 год. У ім знойдзем, напрыклад, звесткі аб тым, калі Полацк атрымаў магдэбургскае права, калі была ўтворана Мінская губерня. Складальнікі календара не абышлі сваёй увагай дату 25 сакавіка 1918 года. Пазнаёмілі чытача са зместам статутных грамат, далі даведку аб палітычных дзеячах і структуры органаў БНР. Але ў календары мы не знайшлі дату абвяшчэння БССР, дзяржавы, праіснаваўшай больш сямідзесяці гадоў. І ў новым выданні календара такі падыход.

Ці не падобныя мы на тых студэнтаў, якія ў дні экзаменаў з бібліятэчных падручнікаў вырываюць асобныя лісты? З той толькі розніцай, што яны вырываюць патрэбны ім матэрыял, а мы -- непажаданыя нам старонкі нашай гісторыі. Але ж гісторыя не музей васкавых фігур, дзе па волі фантазіі можна свабодна маніпуліраваць экспанатамі, за адзін стол пасадзіць выдатнага палкаводца і куртызанку.

Гісторыю як рэальны працэс нельга перапісаць. З гісторыі нічога не выкінеш. Мінулае не зменіш, хіба што на паперы. Яго трэба прымаць такім, якім яно было, нічога не прыбаўляючы і нічога ад яго не адсякаючы.

Асабліва павышаныя патрабаванні навуковасці, дакладнасці фактаў павінны прад"яўляцца да падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, а таксама да навукова-папулярных работ. Фальшывая гісторыя дэзарыентуе гістарычную памяць. Нацыянальная свядомасць народа павінна ўбіраць у сябе дакладную інфармацыю. Толькі праўдзівая гісторыя здольная прывіваць народу дэмакратычную нацыянальную свядомасць, быць актыўнай стваральнай сілай у грамадскай перабудове.

Перад'юбілейная дыскусія завастрыла ўвагу да шэрагу праблем, што патрабуюць далейшай паглыбленай навуковай распрацоўкі. Перш за ўсё неабходна аб"ектыўна, непрадузята ацаніць вопыт нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, пачынаючы з 1917 года. Калі БНР і Рэспубліка Беларусь -- вы... шыя формы дзяржаўнага ... ця, як гэта вынікае з публікацый і палітычных заяў, аб якіх размова ішла вышэй, то як быць з "камуністычнай" БССР?

Прытрымліваючыся вядомых наиноўшых тэорый, прасцей простага аб"явіць БССР, як і... савецкае, бальшавіцкім эк... рыментам, трагічным адхіленнем ад магістральнага шляху развіцця чалавецтва. І ўсё ж нікуды не дзецца ад канстатацыі таго, што "кнорынска-мясніковская БССР" (так яе часам называюць) была пачаткам рэальна функцыяніруючай нацыянальнай дзяржаўнасці, што прайшла шэраг этапаў свайго развіцця.

У ліку яе стваральнікаў і кіраўнікоў такія вядомыя нацыянальныя дзеячы, як Зміцер Жылуновіч, Аляксандр Чарвякоў, Усевалад Ігнатоўскі. Цаной жыцця заплацілі яны за свае намаганні рэалізаваць нацыянальную ідэю на сацыялістычнай аснове. Як бы ні ацэньвалі месца БССР у нашай гісторыі, ніяк нельга таксама абмінуць пытанне, чаму ўсё ж у грамадзянскую вайну ўсталявалася БССР, а не БНР.

Складанасць, супярэчнасць гістарычнага працэсу, безумоўна, абцяжарвае пошук ісціны. Але не меншыя цяжкасці на гэтым шляху стварае так званы сацыяльны заказ, моц створаных у імя тых ці іншых прапагандысцкіх мэтаў схем, палітычная настроенасць, зацыкленасць на тым ці іншым пытанні і інш.

"...Неабходна развянчанне міфаў, якімі перапоўнена наша гісторыя", -- заклікае Васіль Быкаў. Сапраўды, гэта задача першаступеннай важнасці. На думку пісьменніка, "міфы былі, як слупы ў плоце, за якія трымаліся ўсе тыя, хто здзяйсняў уладу над народам, хто ўрэшце і завёў яго туды, адкуль невядома як цяпер выбрацца" ("Н.Г.", 1993, 7 красавіка).

Але не так проста пазбавіцца ад фальшу ў гістарычнай навуцы, а тым больш ад міфаў, што трывала заселі ў грамадскай свядомасці. Адна з важнейшых перадумоў аднаўлення праўды -- глыбокае даследаванне крыніц, проціпастаўленне скажэнням дакладных фактаў, глыбокае філасофскае пераасэнсаванне гістарычнага працэсу. Дыскусія наконт сакавіцкіх падзей 1918 года дае багаты матэрыял для разважанняў. На гэтым можна было б і скончыць нашы нататкі. Але маецца яшчэ пытанне, якое ў рамках тэмы нельга абысці.

13. РАДА БНР ЧАКАЕ...

У міжнародным праве, як вядома, ёсць паняцце — "урад у выгнанні". Такім урадам лічыць сябе і Рада БНР, якая нагадала сваімі акцыямі сусветнай супольнасці дзяржаў аб няздзейсненай Беларускай Народнай Рэспубліцы.

У юбілейныя дні Рада БНР праявіла сябе як актыўна дзеючы палітычны фактар. Яе старшыня Язэп Сажыч, які прыбыў на ўрачыстасці ў Мінск, зрабіў заяву адносна сучаснага становішча Беларусі, а таксама характару адносін Рады БНР з Рэспублікай Беларусь. Выказванні Я.Сажыча гучалі, бадай, не як парады і пажаданні, а як нешта, маючае легітымныя падставы. Рада лічыла, што мае права ацэньваць дзеянні ўладаў РБ, ухваляць ці не ўхваляць іх. У прыватнасці, Я.Сажыч заявіў, што "выхад з няволі яшчэ не завершаны", кансерватыўны ў сваёй большасці склад Вярхоўнага Савета. Не ўхвалялася рэабілітацыя "злачыннае камуністычнае партыі". Спасылаючыся на ўстаўныя граматы БНР, Я.Сажыч быў рашуча супраць надання і афіцыйнага статуса рускай мове, таму што гэта несумяшчальна з суверэнасцю РБ. І як вывад: сучасны палітычны стан Рэспублікі Беларусь не адпавядае абвешчаным у сакавіку 1918 года прынцыпам, умовы пакуль не саспелі для таго, каб Рада БНР магла здаць свой мандат "беларускаму ўраду на бацькаўшчыне" ("Н.Г.", 1993, 24 сакавіка).

У сучаснай Рады БНР сваё разуменне легітымнасці беларускай дзяржаўнасці, якое, на наш погляд, выходзіць за рамкі дзяржаўнага і міжнароднага права. Яго ця... напрыклад, узгадніць з Дэ... зацыяй аб суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 года, што не прызнае ніякай іншай улады, акрамя той, што ідзе ад народа Беларусі. У міжнародным плане незалежнасць Рэспублікі Беларусь, члена ААН, суб... шматлікіх міжнародных пагадненняў, прызналі больш за 100 дзяржаў свету.

Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада салідарная з заявай Я.Сажыча. Яна лічыць, што "ідэалы 25 сакавіка ў Рэспубліцы Беларусь яшчэ не дасягнуты", што "наша краіна яшчэ не стала дэмакратычнай, прававой і сацыяльнай дзяржавай". Больш таго, існуе рэальная пагроза страты незалежнасці ("Н.Г.", 1993, 12 сакавіка). Рада БНР "павінна дзейнічаць да таго часу, пакуль не будзе прынята дэмакратычная Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, пакуль не будуць праведзены выбары ў новы орган заканадаўчай улады на падставах усеагульнага, прамога, роўнага выбарчага права, пакуль з тэрыторыі Беларусі не будуць выведзены ўсе замежныя войскі". У наяўнасці дваістасць пазіцыі: адначасова прызнаецца і Рэспубліка Беларусь, і "ўрад у выгнанні", але маральна-палітычны статус апошняга мае для Грамады прыярытэтнае значэнне.

Своеасаблівую падтрымку Радзе БНР аказала 3-я Усебеларуская палітычная канферэнцыя (ліпень 1993 года, Мінск), у якой паводле паведамленняў прэсы, прынялі ўдзел прадстаўнікі беларускай дыяспары і кіраўнікі дэмакратычных партый метраполіі. ("ЛіМ", 1993, 10--16 ліпеня). Яна "засведчыла, што пастанова 2-й Усебеларускай канферэнцыі аб прызнанні бальшавіцкага рэжыму была гістарычнаю памылкай, актам празмернай даверлівасці бальшавікам, што старшыня ўрада БНР не меў паўнамоцтваў на падпісанне пастановы канферэнцыі" ("ЛіМ", 1992, 10--16 ліпеня). Тым больш, што канферэнцыя была "палітычнай авантурай, арганізаванай і інспіраванай бальшавікамі". ("Звязда", 1993, 7 жніўня). Таму няма падстаў для сцвярджэння, што Рада БНР страціла сваю легітымнасць, якую яна захоўвае і цяпер "у адрозненне ад Вярхоўнага Савета РБ, які ўтрымлівае ўладу супрацьзаконнымі метадамі" (там жа).

Час пакажа, у якіх формах адбудзецца перадача Радай БНР сваіх паўнамоцтваў і рэліквій Рэспубліцы Беларусь і скасаванне "ўрада ў выгнанні". На Украіне і ў Прыбалтыцы гэта ўжо адбылося.

***

Як заўважыў чытач, у нарысе закрануты пытанні беларускага нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Зроблена спроба канцэптуальна паглядзець на гэты складаны, крайне супярэчлівы працэс, выказаць свае адносіны да спрэчных праблем. Паважаючы плюралізм думак, аўтар далёкі ад таго, каб навязваць каму-небудзь свае ацэнкі і вывады. Ён гатовы прыняць любую крытыку ў свой адрас акрамя абвінавачванняў у вольным абыходжанні з фактамі. "Суверэннасць" факта — найпершая ўмова навуковасці гісторыі, ды і не толькі гісторыі.

Вадзім КРУТАЛЕВІЧ,
галоўны супрацоўнік Інстытута філасофіі і права АН Беларусі.

Заканчэнне.
Пачатак у №№ 47--1(1994 г).



Зіма ў лесе.

Фота А. ВАЛЯНЦІНАВА.

НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ

ШТО ЗРАБІЎ БЕЛАРУС ІЛЬЯ КАПІЕВІЧ ДЛЯ МАЛАДОЙ РАСІІ

У не напісанай да гэтага часу гісторыі беларускага пратэстантызму значнае месца павінна было быць адведзена пратэстантам-эмігрантам, якія адыгралі прыкметную ролю ў духоўным жыцці Еўропы як Заходняй, так і Цэнтральна-Усходняй і Усходняй.

Звяртае на сябе ўвагу дзейнасць аднаго з паплечнікаў Пятра І, які падтрымліваў пратэстантаў, -- беларуса Ільі Капіевіча, што падпісваўся ў сваіх зваротах да будучага пераўтваральніка Расіі так: "духовнаго чина, веры реформаторския собору Амстердамскаго".

У адрозненне ад многіх, І. Капіевіч адразу ж становіцца актыўным прыхільнікам радыкальных рэформаў рускага жыцця з самага іх пачатку на рубяжы XVII і XVIII стагоддзяў.

Тады ж, у паваротны момант лёсу Расіі, асабліва востра паўстала пытанне аб неабходнасці ў самы кароткі тэрмін асвоіць галоўныя дасягненні Захаду ў навуцы, тэхніцы, прамысловай вытворчасці. Для гэтага перш за ўсё патрэбны былі кнігі -- важнейшыя праваднікі ведаў і культуры. Падобныя кнігі немагчыма было надрукаваць у Расіі: у адзінай тады друкарні -- на Маскоўскім друкарскім двары -- выдавалася пераважна рэлігійная літаратура.

Узнікшая праблема вырашылася нечакана: Пётр І захацеў прыцягнуць для гэтага людзей, якія добра ведалі рускую мову і жылі на Захадзе. Яны, на яго думку, з поспехам маглі справіцца з нялёгкай задачай удалечыні ад Расіі.

Найбольш падыходзячай фігурай для такой справы аказаўся І. Капіевіч, чалавек надзвычай багатага на падзеі лёсу.

Народжаны недзе на сучаснай Міншчыне, ён быў вывезены ў дзевяцігадовым узросце ў Расію ў Цвярскі край, затым уцёк хутчэй за ўсё ў Маскву і праз шэсць гадоў выехаў дамоў разам з мсціслаўскім ваяводам Цеханавецкім. На жаль, маёнтак І. Капіевіча ў Беларусі аказаўся захопленым каталіцкай царквой, сам ён аб'яўлены здраднікам. Давялося эмігрыраваць на Захад.

Знаёмства Пятра І з І. Капіевічам адбылося ў час знаходжання ў Галандыі, самай перадавой тады краіне кнігавыдавецкай справы, так званага вялікага пасольства Расіі (1696—1698 гады).

(Заканчэнне на 8-й стар.).

Зінаіда КАНАПЕЛЬКА ВЫЙШЛА НА СЦЭНУ 60 ГАДОЎ НАЗАД

ТЭАТР — ЯЕ ДОМ



УСЁ яе жыццё -- віцебскі тэатр. Ён і дом, і сям'я. У ім сканцэнтраваліся яе радасці і беды. Яна ўсё жыццё любіла яго і застаецца ягонай гордасцю. Пісаць пра адносіны Зінаіды Канапелькі і тэатра -- тое ж самае, што пісаць пра каханне двух людзей, якое не загінула праз паўстагоддзя. Можна толькі падзівіцца і пажадаць такога ж сабе і людзям. І яшчэ павучыцца вернасці і адданасці.

Зінаіда Канапелька была вельмі прыгожай: залатыя косы, чароўная постаць, цудоўны голас. Яна магла выбіраць. Хоць і любіла цырк, оперу, аднак пераадолела спакусу, засталася ў студыі Другога Беларускага дзяржаўнага тэатра (зараз -- тэатр Якуба Коласа). Туды яна трапіла яшчэ калі вучылася ў сярэдняй школе. Вучылася ў трэцяй па ліку студыі (1934--1938 гады) тэатра, мастацкім кіраўніком якой быў Цімох Сяргейчык. Майстэрства акцёра на курсе выкладалі Аляксандр Ільінскі і Павел Малчанаў. Нездарма Зінаіда Ігнатаўна лічыць, што ёй пашанцавала ў жыцці на сустрэчы з выдатнымі людзьмі. Яна можа бясконца распавядаць пра сваіх настаўнікаў. П.Малчанаў пазнаёміў яе з Янкам Купалам падчас рэпетыцый у студыі п'есы "Паўлінка". Паэт блаславіў Зінаіду Канапельку на ролю Паўлінкі і сказаў: "Ты беларуская дзяўчына, і вочы твае -- васількі". Ці забудзецца такое?

На самым пачатку вучобы дачкі ў студыі бацькі Зінаіды Канапелькі вымушаны былі ехаць працаваць на Далёкі Усход. Зіначка ж засталася адна ў горадзе. Было ёй 15: Сюды хутка прыйшла вайна. Сёння Зінаіда Ігнатаўна з болем думае, што давялося пераждаць тады яе бацькам. Але ў 15 гадоў яна ведала толькі, што хоча стаць актрысай, што любіць Віцебск і свой тэатр. Таму вучыцца трэба шмат, нягледзячы на голад і вечны недахоп грошай. Дзякуй Богу, што добрыя людзі запрашалі на абед, час ад часу пазычалі сукенку, каб было ў чым хадзіць на спатканні.

Канец 30-х гадоў -- адзін з самых цяжкіх перыядаў у гісторыі нашай краіны. Рэпрэсіі, арышты. Усё гэта праходзіла на вачах Зінаіды Ігнатаўны. Забіралі акцёраў, кіраўнікоў тэатра. Але тады гэта ўспрымалася як арышт злачынцаў. Мала хто здагадваўся пра масавыя рэпрэсіі. Зінаіда Ігнатаўна марыла пра мастацтва, ролі, каханне. І яшчэ ў яе, як і ва ўсіх тады, жыла вера ў светлую будучыню. Яна і чакала яе разам з усімі з дня на дзень.

Але замест яе прыйшла яшчэ адна вайна, смерць адзінага сына. Эвакуацыя. Шмат гадоў ператварыліся ў пераадольванне сябе, абставін. Аднак заставаліся ролі і жыццё на сцэне. Яны саграваліі яе і тады, калі Зінаіда Ігнатаўна вярнулася разам з тэатрам у халодны разбураны Віцебск. Горада, як успамінае актрыса, не было амаль наогул. Пасля вайны недалёка ад вакзала пасадзілі алею ліп. Да сённяшняга дня яны выглядаюць кволымі, бо іх садзілі на зруйнаванай зямлі. Акцёры мерзлі ў прыстасаваным пад тэатр будынку без святла, пераходзілі праз Дзвіну, праз якую не засталося ніводнага моста.

На спектаклях тэатра Якуба Коласа мне падумалася: сапраўды, усё паўтараецца. Зінаіда Ігнатаўна іграла паўстагоддзя таму наперакор холаду і голаду. Сёння артысты зноў выходзяць на сцэну, забаўляюць, весяляць публіку і пры[illegible]аюць яе думаць, таксама пераадоль[illegible]очы холад. Хоць будынак тэатра прыгожы і даволі новы (58-га года), але сёлета ў лістападаўскія маразы ён застываў страшэнна. Мужчыны аддавалі на сцэне свае пінжакі жанчынам у танюсеньк[illegible] сукеначках.

Ве[illegible] шкада, што я не бачыла, як Зінаі[illegible] Канапелька іграла ў часы сваёй маладосці. Мяне проста не было тады на свеце. Яна паланіла сваім мастацтвам людзей. Зінаіда Канапелька — выдатная актрыса. Інакш як жа магла яна быць Ганерыльяй у "Каралі Ліры", Палінай у "Трыбунале", Насцяй у "Несцерцы", лэдзі Мільфард у "Каварстве і каханні"? Колькі трэба таленту, каб адчуваць сябе на сцэне і простай жанчынай, і асобай каралеўскага роду! Яна не іграла, а жыла на сцэне. Зінаіда Ігнатаўна кажа, што падчас дзеі на сцэне яна ні на хвіліну не ўспамінае пра сябе, жыве толькі лёсам свайго персанажа.

У яе шмат паклоннікаў. Да сённяшняга дня Зінаіда Канапелька атрымлівае лісты ад акцёраў, з якімі калісьці працавала; ад незнаёмых людзей, якія памятаюць яе на сцэне. Калі я чытала добрыя словы, што пішуць ёй люд[illegible]то зразумела, адкуль у яе столькі [illegible]ыні ў адносінах да іх. Яна нарадзілася ад любві актрысы да людзей і іх да яе. Акцёры тэатра ў адным з віншаванняў да дня нараджэння назвалі калегу сонцам, якое свеціць ім ужо некалькі дзесяткаў гадоў. Зінаіда Ігнатаўна была добра знаём[illegible] [illegible]етрусём Броўкам і Пятром Машэра[illegible] Паэт пісаў ёй вершы, калі яна была яшчэ зусім маладая і ў больш сталым узросце. Ён захапляўся талентам актрысы і яе прыгажосцю.

У тэатры Якуба Коласа Зінаіда Канапелька сыграла 250 роляў, змагла зразумець іх і прымусіць гледача адчуць душу сваіх гераінь. Калі да роляў гістарычных асоб, гераінь класічных твораў яна рыхтавалася па кнігах, мастацкіх альбомах, то характар беларускай жанчыны быў ёй знаёмы. Яна добра ведала, колькі душэўнай сілы трэба, каб цярпліва працаваць, гадаваць дзетак і захаваць дабрыню і любоў да людзей. І яна ўмее паказаць гэтыя якасці на сцэне, за што і цэняць яе талент нацыянальнай актрысы. Зінаіда Ігнатаўна іграе ў тэатры да сённяшняга дня. Усё сваё жыццё яна імкнулася выконваць нават эпізадычную ролю так, каб яе заўважылі.

Наогул, масоўка ў коласаўскім тэатры не проста прысутнічае, а іграе. Іграе і Зінаіда Ігнатаўна ў ёй. Яна, мне падаецца, адразу разгубілася б у жыцці, калі б у ім не стала яе тэатра. Ён -- яе дом, як яна кажа. І там яна часам сапраўды жыве. Здароўе ўжо не тое, што ў маладосці. Хоць ужо тады Зіначцы, якая бегала на высокіх абцасах, не пашанцавала: упала на лесвіцы і пашкодзіла нагу. Потым у эвакуацыі рубіла галлё і зноў рассекла сякерай нагу. У сталым узросце гэта ўсё адгукнулася: хадзіць стала цяжка і балюча. Зінаіду Ігнатаўну прывозяць у тэатр на машыне. Калі яна іграе некалькі вечароў запар, то застаецца на ноч у тэатры ў прафсаюзным пакоі, такім халодным, што сагрэць яго немагчыма. Зінаіда Ігнатаўна зусім не скардзіцца на лёс. Яна ўпэўнена, што ён існуе. А ягоныя цяжкасці ёй дапамагала пераадольваць зноў-такі сцэна.

Калісьці ёй прыходзілася спадзявацца толькі на дапамогу людзей. Зараз дапамагаюць таксама. Моладзь то бульбы прынясе, то яшчэ чаго-небудзь.

Зінаіда Ігнатаўна сёння -- народная артыстка Беларусі, ганаровы грамадзянін горада Віцебска. У яе ёсць ордэны Дружбы народаў, Знак Пашаны.

На жаль, Зінаіда Ігнатаўна амаль не здымалася ў кіно. Але ў фільме "Алімпіяда" рэжысёра Аляксандра Гутковіча паводле рамана І.Пташнікава ў яе была роля. Яна іграла жанчыну з пакалечаным лёсам: у час вайны ў яе загінула дзіця, і яна шмат гадоў не можа гэтага зразумець. З.Канапелька паказала сябе вялікім майстрам у гэтай ролі. У тэатры Якуба Коласа збіраюцца ставіць спецыяльна для Зінаіды Ігнатаўны п'есу пра старую актрысу, у якой маладыя пачуцці і ёсць надзеі. Хочацца спадзявацца, што ўбачым спектакль у хуткім часе. У тым жа, што Зінаіда Канапелька будзе рабіць усё, каб працягваць іграць на сцэне, я ўпэўнена. Нездарма ж яна кажа, што пойдзе з жыцця толькі па лесвіцы свайго тэатра, свайго дому.

Алена СПАСЮК.

НА ЗДЫМКУ: Зінаіда КАНАПЕЛЬКА.

Фота А. ХІТРОВА.

ПОЗНІ ЗВАНОК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

З характэрным яго пяру раблезіанскім размахам Караткевіч — у самай першай рэдакцыі "Зямлі пад белымі крыламі" -- маляваў побыт беларусаў такімі нясцерпна буйнымі фарбамі, што, збоку зірнуўшы на такое піраванне жыцця (а ўпершыню "Зямля пад белымі крыламі" выйшла на Украіне, у нас яна ішла ўжо як бы аўтарскім самаперакладам з украінскае мовы), кожны сказаў бы: "А чорт іх не браў, гэтых беларусаў, як цары жылі, елі сала з салам і спалі на саломе..." На самай жа справе хто з нас, людзей яшчэ старэйшага пакалення, не памятае, не ведае, як раскашаваў "пан сахі і касы". Хлеба да новага ўраджаю мала ў каго хапала, не тое, каб выстаўляць на святочныя сталы па якіх трыццаць абавязкова-традыцыйных беларускіх страў... Каб гойсаць па паляваннях ды фарсова прытупваць бліскучымі чаравічкамі ды хромавымі — у гармонік — ботамі "Лявоніху"... была, была, вядома, і людская здатнасць, і непадробная весялосць, і, як прысак, іскрысты гумар... Але быў, быў і пэўны "перакос" у маючай быць кнізе... І перш за ўсё ад вялікіх пачуццяў, што перапаўнялі аўтара, ад нястрымнай натхнёнай сілы ў руцэ, якая вадзіла маляўнічым пэндзлем... Патрабавалася, была відавочная неабходнасць "ураўнаважыць" кнігу рэалістычнай (і гістарычнай!) аўтарскай развагай. І аказалася гэта — напачатку — вельмі няпроста...

— Хто гэта будзе мяне тут вучыць?... Мяне — чытаюць!

Патрабаваўся "трацейскі суд". І аўтара "вучыў" лепшы яго друг, сябра... (І наш — рэдакцыйны -- вельмі паважаны аўтар і дарадца). Яны ўпоравень — абое — стаялі і па сваіх энцыклапедычных ведах, і па сваёй літаратурнай вазе... Бескампрамісную ("Платон, ты мой сябра, але ісціна..."), аднолькава патрабавальную і добразычлівую рэцэнзію для рэдакцыі друг Караткевіча напісаў, здаецца, на трынаццаці старонках... Я запрасіла па тэлефоне Уладзіміра Сямёнавіча прыйсці пазнаёміцца з рэцэнзіяй.

Ён прыйшоў вельмі хутка. Стрымана павітаўся. Распрануўся, павесіў паліто і сеў у самым зацішным нашым закутку ("Мастацкая літаратура" з усімі сваімі рэдакцыямі і службамі ціснулася тады ў двухпавярховым асабнячку побач з "фабрыкай-кухняй"). У нашым пакоі — у ім месцілася адразу тры рэдакцыі — запанавала пагрозлівая цішыня, як перад вялікай бурай. Караткевіч чытаў засяроджана, доўга, сціснуўшы вусны і сурова звёўшы бровы. А калі скончыў, узняўся і неяк як бы пазяхнуў:

-- Рэцэнзент -- дурань! Ён нічога не зразумеў... — Згарнуў рэцэнзію, паклаў у кішэню і, цырымонна пакланіўшыся агульным паклонам усім, хто сядзеў у пакоі, выйшаў.

...Раней як праз тыдзень прынёс ён у рэдакцыю рукапіс "Зямлі пад белымі крыламі". Чысты. Нанава перадрукаваны. Пасля дапрацоўкі — па рэцэнзіі Друга. Ніводную нязгоду не толькі па зместу, а нават па стылю, па сінтаксісу, ніводнай "косачкі" не пакінуў ён без увагі. І павагі -- да ўвагі Друга...

І кніга -- на гонар аўтару і рэдакцыі, а, можа, найгалоўней, на гонар нашай беларускай зямлі і літаратуры таксама -- высака і шырака ўзмахнула сваімі белымі крыламі! Далёка і за межамі яе таксама.

І вось я трымаю яе ў руках. Перагортваю яе: "Мілай Алене Сямёнаўне Васілевіч, з якой разам пакутавалі над гэтай кнігай. Ул. Караткевіч. 22.XI.77."

***

Мне ўяўляецца, як ён працаваў, як пісаў свае кнігі, Уладзімір Караткевіч.

Фантасмагорыя самых неверагодных праяў і вобразаў сядлала яго ўяўленне, і яно, як дзікае паляванне караля Стаха, неслася, неслася, імчала напрапад, не прыпыняючыся і не аглядваючыся, не звяртаючы ўвагі ні на што на сваёй дарозе... Таму, напэўна, не выпадкова, што пры ўсёй сваёй такой красамоўнай выразнасці, мастацкае палатно Караткевічавай прозы часам не-не ды і спыніць зрок на моўнай хібе, здзівіць недакладнасцю, а часам і вельмі прыблізнай псіхалагічнай характарыстыкай. І ўражанне пакіне такое (магчыма, гэта суб'ектыўнае маё ўражанне-ўспрыманне), што ён не заўсёды паспяваў перачытаць, на слых "спрабаваць" усяго таго, што нараджалася з-пад яго імклівага пяра, асядланага неверагодным уяўленнем.

Аднак ён не даваў чытачу часу, ні настрою не ствараў у яго, каб вось узяць і настырна і нудна вышукваць і аловачкам падкрэсліваць, адзначаць, выпісваць... ("Дзед выцер жалейку аб прыпол сарочкі"... "За пісьмовым сталом, за якім яны спяшаюцца запісаць апошнія палаючыя думкі, дыхаючы каваламі лёгкіх..." "Апошнія адбіткі промняў падалі на яе твар, які ляжаў у мяне пад пахай"...).

Дзе там! Вы імчалі за ім далей. Вы былі ўжо ў зусім іншым, але ўсё роўна, зноў, у тым жа Караткевічавым "вымярэнні".

"Ля дзвярэй стаяў на падлозе вялікі бюст Вальтэра, вельмі падобны на гаспадыню, і какетліва на мяне пазіраў з-пад анучы,

ЧЫРВОНЫ СТРУМЕНЬ СВАБОДЫ

(Валерый УРУБЛЕЎСКІ)

Не кожны вытрымае поўнае трывог і небяспекі жыццё паўстанца-партызана. 15 жніўня 1863 года Духінскі, зусім знясілены цяжкімі партызанскімі паходамі, атрымаў адстаўку і выехаў за мяжу. Камандуючым усімі паўстанцкімі ўзброенымі сіламі Гродзеншчыны цяпер ужо і афіцыйна становіцца Валерый Урублеўскі. Загад аб яго прызначэнні падпісаў Кастусь Каліноўскі, які да гэтага часу зноў узначаліў беларуска-літоўскі паўстанцкі цэнтр ("Выканаўчы аддзел") у Вільні. "Палкоўнік Духінскі (прызначаны Высоцкім[1]), хаця і з дазволу Аддзела выехаў,аднак выездам гэтым не Аддзел яму, а ён Аддзелу, а асабліва Гродзенскаму ваяводству, вялікую ласку зрабіў", -- з палёгкай каменціраваў перамену на Гродзеншчыне Каліноўскі ў пісьме да свайго сябра Б.Длускага. Задавальненне Каліноўскага можна лёгка зразумець. Замест чалавека, што з самага пачатку толькі замінаў руху, губерню ўзначаліў нястомны працаўнік рэвалюцыі, якому Каліноўскі верыў, як самому сабе.

Урублеўскі ўводзіць новую тактыку, фарміруе невялікія "выканаўчыя" атрады па 20--30 чалавек на чале з паваротлівымі людзьмі і рассылае іх з Глыбокага Кута, дзе быў у той час паўстанцкі лагер, у вёскі разганяць царскую паліцыю, чытаць паўстанцкі маніфест, надзяляць сялян зямлёй, здзяйсняць волю рэвалюцыі. Інструкцыя прадпісвала чытаць маніфест па-беларуску. У паўночную частку Ваўкавыскага павета адправіўся "Янка з-пад Гродна" (ці няма тут свядомай пераклічкі з "Яськам з-пад Вільні" і яго "Мужыцкай праўдай"?), у паўднёвую -- "Юзюк з Беластока", у Шэрашаў -- "Марэль", у Белавежскую пушчу -- "Галабурда". У загадах, дзеяннях Урублеўскага б"ецца адна думка: галоўнае -- сувязь з народам. Без яе гібель. Ды і навошта паўстанне, калі няма спачування і падтрымкі народа?..

У канцы жніўня царскія ўлады высачылі лагер Урублеўскага, падкінулі свежыя войскі. Глыбокі Кут прыйшлося пакінуць. Зноў поўныя цяжкіх выпрабаванняў маршы. У верасні Урублеўскі знаходзіўся то ў Свіслацкай, то у Белавежскай пушчы, потым, не маючы спакою ад карнікаў, перайшоў у Пружанскую пушчу, дзе ва ўрочышчы Туроса падзяліў атрад на групы па 10--30 чалавек і сам застаўся з чатырма дзесяткамі людзей.

Імя няўлоўнага, таленавітага паўстанцкага камандзіра грымела па ўсёй Беларусі і Літве. Сам Мураўёў-вешальнік непасрэдна сачыў за карнымі аперацыямі па знішчэнню паўстанцкіх атрадаў на Гродзеншчыне і загадаў стварыць у пушчы з лясных аб"ездчыкаў спецыяльную групу для пошукаў Урублеўскага, "які, як былы іх непасрэдны начальнік, павінен ім быць асабіста вядомы". Мураўёў пагражаў лясной варце, якая даўно была на падазрэнні ў царскіх улад, вялікімі карамі. Нягледзячы на гэта, варта не вельмі шчыравала...

Стаяла восень, не за гарамі ўжо была цяжкая для партызанскай вайны зіма. Трэба было агледзецца, абдумаць перспектывы далейшай барацьбы.

Разам з Арамовічам Урублеўскі пакінуў пушчу, каб бліжэй пазнаёміцца са становішчам спраў у ваяводстве, а потым пад чужым іменем выехаў у Варшаву. У яго ўзнік план зімовай канцэнтрацыі ўсіх уцалелых беларускіх груп і атрадаў за Бугам -- у Каралеўстве Польскім. План падтрымаў Каліноўскі. Трэба было захаваць кадры, каб вясной распачаць на Беларусі новыя дзеянні.

Для канцэнтрацыі беларускіх паўстанцаў Валерый аблюбаваў Ліпняк на Падляшшы -- некалькі хат сярод балот і лясоў. Мясціна глухая. Да Беларусі -- рукой падаць. І народ тут русіны -- амаль такі ж сама, як дзе-небудзь пад Ваўкавыскам і Лідай.

Галоўная думка Урублеўскага, піша Арамовіч, "аб"яднанне ўсіх літоўскіх (беларускіх) атрадаў для прадстаўніцтва Літвы ў Кангрэсоўцы (Каралеўстве Польскім) у часе зімовага руху".

Адпаведны загад ляціць у паўстанцкія групы, што яшчэ трымаліся на Гродзеншчыне, а таксама тым беларускім паўстанцам, якія ўж[illegible]чней перайшлі ў Польшчу.

Прадстаўнік брэсцкага атрада Ягмін, які адправіўся ў новы лагер, успамінаў пазней, што "сустрэў там мноства незнаёмых асоб, сярод якіх малады чалавек гадоў дваццаці васьмі, дужы брунет сярэдняга росту і моцнага складу, аказаўся самім ваяводаю". "Ш[illegible]кладала яго славу, -- піша Ягмін пр[illegible]рублеўскага, -- гэта майстэрства валодаць зброяй і асабліва трапная стральба,.. яго партыя (атрад) асабліва вызначалася трапнасцю стральбы".

Фарміраванне беларускіх паўстанцаў у Ліпняку прыкрываў палкоўнік Крысінскі. Хутка тут утварыўся атрад пяхоты з 200 чалавек. Камандаванне па распараджэнню Урублеўскага прыняў былы афіцэр Багуслаў Эйтмановіч. 17 лістапада беларусы разам з Крысінскім мелі пераможную сутычку з карнікамі паміж Расошай і Ламазамі ў Бяльскім павеце.

Сам Урублеўскі ўзначаліў атрад беларускай конніцы з двухсот чалавек, які дзейнічаў то сумесна з Эйтмановічам і Крысінскім, то асобна.

Адбываліся амаль бесперапынныя сутычкі: пад Калянам, Гарбавам, Старосцінам. Потым на цэлы месяц царскія стратэгі пакінулі паўстанцаў у спакоі, думаючы, магчыма, што надыходзячая зіма падзейнічае на "інсургентаў" мацней, чым кулі.

Кружачы вакол Любліна, конны атрад Урублеўскага з"яўляўся ў Немцах, Завепшыцах і Ленчнай, часам сустракаючыся з коннікамі паўстанцкіх генералаў Крука і Валігурскага і маёра Панінскага з Украіны, які з гэтай пары дзейнічаў разам з беларусамі.

30 снежня -- у перадапошні дзень гераічнага 1863 года -- атрад Валерыя пасля цяжкага маршу марознай парой прыбыў у Малую Букову. Здарожаныя, перамёрзлыя коннікі спешыліся і былі гасцінна прыняты ў сядзібе. Нехта сеў за фартэп"яна. Пачуліся гукі мазуркі. Усю ноч не гаслі агні, над аколіцай не моўклі паўстанцкія песні. Пелі, напэўна, і тую, беларускую -- "Ой, у хаце не астацца..."

На золку наляцелі драгуны. Нягледзячы на вялікую колькасную перавагу карнікаў, трэба было прымаць бой, каб выратаваць пешы беларускі атрад, які знаходзіўся паблізу. Сутычка была жорсткай. Конніца секлася з конніцай. Пяхота Эйтмановіча ў парадку пасоўвалася да Жыліна, конніца з боем адыходзіла да Волі Верашчынскай. Пасля бою паўстанцы недалічыліся 18 таварышаў, але задача была выканана.

І ўсё-такі праз шэсць дзён галоўная частка беларускай пяхоты была пасе[illegible] ў Ядлянцы пад Усцімавам, склаў гал[illegible]ые камандзір Эйтмановіч.

Пасля ад"езду за мяжу хворага Крука камандаванне ўзброенымі сіламі паўстання ў Люблінскім і Падляскім ваяводствах было даручана палкоўніку Урублеўскаму, але ўжо нічога н[illegible]ьга было зрабіць. Гэта былі апошнія[illegible]ы былога пажару.

Урублеўскі з"яўляўся ў розных канцах Люблінншчыны. Пасля сутычкі ў Войцахаве адважны палкоўнік з чатырма дзесяткамі коннікаў рушыў на поўнач. Перайшоўшы Вепш пад Коскам, 19 студзеня атрад пасоўваўся да той жа нешчаслівай Ядлянкі пад Усцінавам, дзе загінула беларуская пяхота.

Генадзь КІСЯЛЁЎ.

[1] Польскі генерал.

Працяг.
Пачатак у № № 50-1 (1994 г.).

якая замест лаўраў вянчала яго галаву... А ў наступным пакоі быў такі гармідар, быццам тут змяшчаўся чатырыста год таму філіял Грунвальдскай бітвы"...

Калі б вам з суседняга пакоя, не паказваючы кнігі ў вочы, хто-небудзь прачытаў усяго толькі два гэтыя пасажы, не сумняваюся, вы беспамылкова захоплена ўсклікнулі б: "Госпадзі, ды гэта ж Караткевіч!"

...Ён умеў быць такім абаяльным, што жанчыны, сустрэўшыся з ім і адпіўшы з келіха яго чараў, няхай сабе толькі маленькі глыток, непрыкметна самі рабіліся чараўніцамі. І, думаю, гублялі галаву не так ужо і рэдка ("Яка чудова, яка чарівна людина!" -- чуецца мне здалёку даўні ўсплёск жаночага захаплення, пра якое сам Караткевіч напэўна нават і не здагадваўся).

З мужчынамі ж, часам нават і з вельмі блізкім сябрам, калі той не надта далікатна наступаў на любы яго мазоль і закранаў яго самалюбства, ён рабіўся раптам ганарысты і пагардлівы, як пыхлівы пан ці старадаўні шляхціц ("Гэта вы хочаце павучаць мяне добраму тону?.." -- і абавязкова з блізкага сяброўскага "ты" пераходзіў на пагардлівае "вы").

Я бачыла, як стаяў ён і пачціва падтрымліваў (у трамваі) сваю высакародную, у цёмным адзенні, маці, калі праводзіў на вакзал у дарогу. "Гэта мая мама", -- наколькі дазваляла трамвайная таўхатнеча, з гонарам пазнаёміў ён мяне з тою, якая ўзводзіла яго па ўласнай радаслоўнай лініі ці не да беларускіх "інсургентаў" -- продак яго па гэтай лініі быў "камандзірам", як сам ён адзначае ў сваёй аўтабіяграфіі, беларускіх паўстанцаў. Дарэчы, гэта "лінія" таксама адна з улюбёных у творчасці Караткевіча: непакора і высакародная годнасць!

...Мы не сябравалі з Уладзімірам Караткевічам. Не былі блізкія "дамамі"... Пры самым першым знаёмстве выбухова зблізіў нас успеты Караткевічам у яго рамане Рагачоў. І зусім "параднілa" старая хвоя-ліра на рагачоўскіх могілках над дняпроўскай кручай. І ён, і я -- у розныя часы -- сядзелі на гэтай хвоі-ліры ў святлейшыя дні свайго юнацтва...

А перад гэтым, у красавіку 1966 года, па дарозе аўтобусам у Гісарскую даліну, калі мы ехалі на стрэчу з чытачамі (удзячны лёс занёс мяне на з'езд пісьменнікаў Таджыкістана), цудоўны чалавек і таленавіты крытык-літаратуравед Аляксандр Макараў захоплена казаў мне:

-- Алена, вы обязательно должны ближе познакомиться с Володей Короткевичем! Это такой необыкновенный мальчик! Белорусская литература будет гордиться им! Володя был самым любимым моим учеником!

(Уладзімір Караткевіч вучыўся ў А.М. Макарава ў Маскве на Вышэйшых літаратурных курсах).

Вось пасля сустрэчы з Макаравым, пасля таго, як перадала я палкія вітанні настаўніка яго вучню і вучань таксама гаварыў пра свайго настаўніка з непадробнай любоўю і абагаўленнем (дарэчы -- супадзенне? -- абодва яны пражылі амаль аднолькавы век. Вучань нават пражыў на год меней за настаўніка...), пасля ўсяго гэтага і "знайшоўся" Рагачоў -- наша агульная адданасць і захапленне, і славутая хвоя-ліра, і доўгая прыязная, натхнёная гаворка. "О Шиллере, о музах, о любви..."

***

Розны ён быў, ох, які розны, Уладзімір Караткевіч! І зусім няма патрэбы далучаць яго сёння да "ліку святых"... Яго самога гэта смяшыла б і абурала. Ён быў у жыцці і ў сваіх кнігах святы грэшнік. Таму і застаўся ў нашай памяці і ў нашым эмацыянальным свеце як непаўторная з'ява.

...Не скажу, каб вельмі трымалася я свят ці памятала да канца хоць адну малітву (за выключэннем, вядома, "Ойча наш"), якім вучыла мяне ў раннім маленстве мая набожная пакутніца маці. А памятаю, якое было нечаканае ўзрушэнне, як радасна, калі аднойчы, у першы дзень Вялікадня, дастала я з паштовай скрынкі дзіўную прыгожую паштоўку з намаляваным велікодным яйкам-"пісанкай". "З Вялікаднем!" -- і больш ні слова -- толькі адваротны адрас на вуліцу Карла Маркса -- Караткевічаў адрас... І так павеяла тады добрым светлым святам у маёй хаце!

***

-- Пазваніце мне! Мне гэта вельмі патрэбна!.. -- прасіў ён у той непрагляднЫ, даўні ўжо вечар.

Чаму я не пазваніла яму?!

Алена ВАСІЛЕВІЧ.

ФЕСТЫВАЛЬ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ



Фестываль народнай творчасці "Спадчына" пачаўся ў Мінску. У ім прынялі ўдзел ансамбль народнай музыкі "Церніца", фальклорныя групы "Сябрына" і "Калі ласка", дзіцячы ансамбль "Кураняты" і іншыя калектывы.

НА ЗДЫМКАХ: юныя танцоры ансамбля "Расінка" з СШ N 123; выступае ансамбль народнай музыкі "Церніца" СШ N 102.

Фота В.ТАЛОЧКІ.



КНІЖКА З БЕЛАСТОКА

Зусім нядаўна, здаецца, прыйшоў да нас зборнік апавяданняў Міры Лукшы "Дзікі птах верабей", які выйшаў летась у Беластоку. І вось новая сустрэча: адтуль жа паступіла чарговая кніжная навінка -- зборнік вершаў той жа М.Лукшы "Замова".

Паэтка не прытрымліваецца традыцыйных вершаваных форм. Тое, што з"яўляецца з-пад яе пяра, пазначана эксперыментам, пошукам як у форме верша, так і ў вобразнавыяўленчых сродках. Змест жа вершаў М.Лукшы -- гэта роздум аб хуткаплыннай сучаснасці. Іншая справа, што ўсё гэта падаецца, так сказаць, не ў лоб. Чытач атрымлівае ад слова М.Лукшы не адну асалоду. Каб дайсці да сэнсу сказанага ёю, ён адначасова мусіць і папрацаваць думкай. Што ж, сапраўдная паэзія -- гэта не канстатацыя вядомага і, тым больш, не звычайнае рыфмаванне...

ЗАХАПЛЕННІ



"Кветкі зямлі" -- так назвала адзін са сваіх твораў майстрыха з Лоева Кацярына СУРЖЫК (на здымку). Яна прадставіла на суд гледачоў вялікі, ручной работы дыван, вышыты старадаўнім спосабам -- крыжыкам. Мала хто нават з людзей старэйшага ўзросту можа пахваліцца веданнем гэтай тэхналогіі. Адмірае, на жаль, нацыянальнае рамяство.

Фота С.ХАЛАДЗІЛІНА.

ШТО ЗРАБІЎ БЕЛАРУС ІЛЬЯ КАПІЕВІЧ ДЛЯ МАЛАДОЙ РАСІІ

(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.).

І. Капіевіч аказаўся каштоўнай знаходкай для маладой Расіі. Яму, па-еўрапейску адукаванаму чалавеку, Пётр І вырашыў даручыць навучанне за мяжой рускіх маладых людзей, а галоўнае -- стварэнне (упершыню ў Расіі!) уласнай навуковай, тэхнічнай і нават мастацкай літаратуры на еўрапейскі, заходні манер.

Сваю работу на карысць Расіі І. Капіевіч пачаў неадкладна: яшчэ ў перыяд знаходжання Пятра І у Амстэрдаме ён спяшаўся закончыць пераклад "Книги, учащей морского плавания" на рускую мову. Не будучы багатым, ён уваходзіць у долю з галандцам Янам Тэсінгам, у друкарні якога выдаюцца ствараемыя І. Капіевічам для Расіі кнігі, так неабходныя ёй тады для знаёмства з дасягненнямі еўрапейскай навукі і культуры.

Гэта была самая разнастайная літаратура -- гістарычная, прыродазнаўчая, тэхнічная, філалагічная, мастацкая.

І сёння не перастаеш здзіўляцца, разглядаючы кнігі, напісаныя і надрукаваныя І. Капіевічам: вялікая не толькі іх колькасць (больш за дваццаць), але асаблівa дыяпазон -- энцыклапедычны ахоп ведаў і практычных уменняў таго часу. Кнігі гэтыя, што сталі цяпер найвялікшай рэдкасцю, пазнаеш адразу -- па асобаму фармату, багаццю афармлення, разнастайнасці гравіраваных ілюстрацый. Яны сталі адным з самых цікавых раздзелаў і ў гісторыі рускага мастацтва. З іх дапамогай рускія людзі знаёміліся з накопленым багаццем еўрапейскай навукі, культуры, "прарубалі" так неабходнае тады акно ў Еўропу.

Прыкладна праз два гады пасля пачатку работы І. Капіевічу ўдаецца стварыць уласную друкарню, праіснавала яна нядоўга, але дала падставы "рускаму" кнігадрукаванню ў Амстэрдаме, якім сталі з поспехам займацца галандскія прадпрымальнікі.

У 1701 годзе мы сустракаем І. Капіевіча ў Берліне, дзе, па словах славутага Г. Лейбніца -- прэзідэнта Прускага каралеўскага навуковага таварыства, з яго дапамогай мяркуецца наладзіц[illegible] рускіх кніг па заказах рускага [illegible].

У 1704 годзе І. Капіевіч у Капенгагене, дзе зноў спрабуе друкаваць рускія кнігі ва ўласнай друкарні і выконвае некаторыя [illegible]клады для рускага пасольст[illegible] Даніі.

У 1706 годзе ён ужо ў Гданьску, дзе складае і друкуе рускую граматыку. Тут жа І. Капіевіча прымаюць на службу ў Пасольскі прыказ -- будучае Міністэрства замежных спраў Расіі, прысягу вернасці якой ён афіцыйна прыносіць 30 чэрвеня 1707 года і становіцца паўнапраўным яе грамадзянінам.

У 1708-м -- паездка ў Варшаву, дзе ён працуе пад кіраўніцтвам славутага дзеяча пятроўскай эпохі Я. Бруса. І заходнееўрапейская адысея І. Капіевіча канчаецца: пасля многіх гадоў нястомнай працы і змаганняў ён нарэшце пераязджае ў Расію і апошнія гады жыцця служыць у Пасольскім прыказе ў Маскве, дзе і памірае ў 1714 годзе.

Выдавец, які стварыў рускую свецкую кнігу і свецкую друкаваную літаратуру, пісьменнік і паэт, які пакінуў нам шэраг сваіх арыгінальных твораў, вучоны, што склаў некалькі граматык і слоўнікаў, паэтыку і рыторыку, педагог, думкі якога ўключаюцца сёння ў спецыяльныя анталогіі, Ільля Капіевіч быў асветнікам-энцыклапедыстам, пра дзейнасць якога лепш за ўсё сказаў ён сам у пісьме да Пятра І: "Потрудился ... на славу ... и на всемирную пользу Великороссийского государства".

Разам з тым нельга перабольшваць значэнне зробленага І. Капіевічам. Кнігі яго з цяжкасцю дастаўляліся ў Расію, дзе распаўсюджванне іх ішло вельмі марудна. Пасля пераезду з Заходняй Еўропы ў Маскву ўжо зусім нямногае паспеў зрабіць "Посольского приказ[illegible] переводчик Илия Копиевский" [illegible] "Илья Федоров Копиевский", які менавіта так падпісваўся на ўсіх дакументах маскоўскага перыяду яго жыцця. Напісанае і выдадзенае ім служыла, за некаторым выключэннем, непра[illegible]цяглы час. Прычына тут у асноўным у кампілятыўнасці і недастатковай навуковасці многіх яго твораў, якія не маглі канкурыраваць з заходнееўрапейскімі выданнямі, што хутка ўвайшлі ў расійскі ўжытак.

Верагодна, самы вялікі поспех у Расіі выпаў на долю "Книги, учащей морского плавания", "Притч Эссоповых" [illegible] лаціна-руска-нямецкага "Номенклатора", гэта значыць, слоўніка, некалькі разоў перавыдадзенага.

Уся кнігавыдавецкая дзейнасць І. Капіевіча і яе вынікі -- гэта хутчэй самы пачатак уваходжання Расіі ў маштабны агульнадзяржаўны кантакт з заходнееўрапейскай навукай і культурай, пачатак спробы такога ўваходжання ці, яшчэ больш трапна, знаёмства з еўрапейскім светам. І ў гэтым роля беларускага пратэстанцкага эмігранта І. Капіевіча, які правёў юныя гады ў Масковіі, а затым апынуўся на Захадзе, вельмі значная і відавочная.

Юрый ЛАБЫНЦАЎ.

У ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Словы Р.АЎЧЫННІКАВАЙ *Музыка Э.ЗАРЫЦКАГА*



Ніхто гэты танец не бачыць, не чуе.
Адна у кватэры жанчына танцуе, жанчына танцуе.
Ніхто не згадае прычыну здарэння --
Танцуе жанчына у дзень нараджэння,
у дзень нараджэння.

Прыпеў:

Дзень нараджэння кахання былога,
кахання былога,
Дзень нараджэння танцуе жанчына,
а побач нікога...

У вальсе жанчына і кружыць, і кружыць.
Аб першым каханні і помніць, і тужыць, і помніць,
і тужыць.
Ах, як яна вальс, гэты вальс танцавала,
Ды песня кахання сваё адыграла, сваё адыграла.

Прыпеў.

Яна усміхнецца -- усё у парадку,
А потым паставіць пласцінку спачатку, пласцінку
спачатку.
Ніхто гэты танец не бачыць, не чуе...
Адна у кватэры жанчына танцуе, жанчына танцуе...

Прыпеў.

Рэдактар Вацлаў МАЦКЕВІЧ

ЗАСНАВАЛЬНІК:

Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом (таварыства "Радзіма").



НАШ АДРАС:

220600, МІНСК, ПРАСПЕКТ Ф. СКАРЫНЫ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Пазіцыя рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", не заўсёды супадаюць.

Газета набрана і звярстана ў камп'ютэрным цэнтры рэдакцыі газеты "Вечерний Минск". Аддрукавана ў друкарні "Беларускі Дом друку". Індэкс 63854. Зак.17. Падпісана да друку 10. 1.1994 г.